Пролетарыі ўсіх краёў, злучайцеся!
Proletarjusze wszystkich krajów, łączcie się!
Пролетарии всех стран, соединяйтесь

САВЕЦКАЯ БЕЛАРУСЬ

15-ты ГОД КАСТРЫЧНІЦКАЙ РЭВАЛЮЦЫІ

ОРГАН ЦВК і СНК БССР
XIII ГОД ВЫДАНЬНЯ
штодзённая газэта

ЧАЦЬВЕР
14 красавіка 1932 г.
№ 84 (3473)

ТЭЛЕФОНЫ:
Адказн. рэдактара 7-69
Адказн. сакратара 4-78
Сэкратароў . . . 6-15
Начная рэдакцыя (два званка) 12-65
Выдавецтва . . 2-44

УМОВЫ ПАДПІСКІ:
1 месяц . . . 1 руб.
3 „ . . . 3 „
6 „ . . . 6 „
Падпіска прымаецца выключна на поштовых лістах.
Рукапісы не зьвяртаюцца

РЭДАКЦЫЯ І ВЫДАВЕЦТВА
МЕНСК, ПЛЯЦ ВОЛІ, 17.

КОШТ АБ'ЯВЫ
1 радка нонпарэлі 1 руб.

КОШТ ПУБЛІКАЦЫІ
аб зьбе і дакументу—2р.

СЕНЬНЯ У НУМАРЫ

АРТЫКУЛЫ: ПЕРАДАВЫ—Пуцёўка—без чаргі!
М. КАНАПЛІН і П. РУДЗІЦКІ—Праз узмацненьне саветаў да бясклясавай грамады (2 і 3 стар.).
ГЕНЭРАЛЬНАЯ ПРАВЕРКА ГАТОЎНАСЬЦІ ДА СЯЎБЫ. Саўгасы могуць і павінны паказваць прыклады барацьбы за бальшавіцкі ўраджай (2 стар.).
Бальшавіцкі адпор усялякім скажэньням у арганізацыі калгаснай вытворчасьці (2 стар.).
Бальшавіцкая вясна патрабуе ад транспарту чоткай работы (3 стар.).
Аб ліквідацыі няпісьменнасьці (Пастанова ЦВК БССР) (3 стар.).
Аб правядзеньні ўсесаюзнага конкурсу на лепшага сьвінара (Пастанова НКЗБ).
Разгарнуць масавую работу па датэрміновым выкананьні фінпляну (1 стар.).
ПЯЦІДЗЕНЬНІК АГЛЯДУ РАБОТЫ БЮРО СКАРГАЎ РСІ (4 стар.).
На канфэрэнцыі Асоавіяхіму Менскай арганізацыі (4 стар.).
ЗА ГРАНІЦАЙ. На Жэнэўскай канфэрэнцыі па разбраеньні (1 стар.).
Белагвардзейская правакацыя на К. У. чыгунцы (1 стар.).

Пуцёўка--без чаргі!

У многіх паўднёвых раёнах БССР, а за імі і паўночных, у самыя бліжэйшыя дні пачынаецца масавая сяўба. Гэта акалічнасьць патрабуе асабліва-га ўзмацненьня тэмпаў падрыхтоўкі да сяўбы ўсяго сацыялістычнага сэктару сельскай гаспадаркі і гаспадарак адна асобнікаў. Задача заключаецца ў тым, каб, ня трацячы ні аднэй мінуты, так разгарнуць падрыхтоўку ў апошнія дні да сяўбы, каб яна (гэта падрыхтоўка) гарантавала-б арганізаваны і цалкам падрыхтаваны рабочы выхад на поле.

Баявая праграма сяўбы, значнае пад вышэйшае ўраджайнасьці палёў, пашы рэньне плошчаў тэхнічных культур—могуць быць выкананы толькі ў тым выпадку, калі ўвага ўсіх партыйных, прафэсіянальных і гаспадарчых арганізацый усіх вучасткаў нашай работы будзе прыкавана да сяўбы.

Буйнейшыя гаспадарча-палітычныя задачы трэцяй бальшавіцкай сяўбы на многа падвышаюць адказнасьць транспарту, вымагаюць ад яго чоткай і бесьперабойнай работы.

Ад транспарту патрабуецца бесчарговае прасоўваньне сяўбовых грузаў: сельска-гаспадарчых машын, мінэральных угнаеньняў, насеньня, несвяжасовая дастаўка якіх пагражала-б поўным зрывам кампаніі. Вялікая колькасьць трактараў і іншых сельска-гаспадарчых машын павінна быць вывезена з заводзкіх двароў на сацыялістычныя палі, прычым павінна быць вывезена своячасова, да пачатку сяўбы, па-ўдар наму і без затрымак. Вывезьці так, каб у першыя-ж дні машыны можна было вывезьці на поле.

Задачы адказныя і вялікія. Але трэба прызнацца, што большасьць чыгуначных раёнаў і вузлоў сустракаюць вясну яўна не падрыхтаванымі.

Мы яшчэ месяц таму назад пісалі аб нездавальняючай рабоце Менскага мясцовага савету па перавозках, які доўга не даваў заявак на сяўбовыя грузы; аб дрэнная рабоце камэрцыйных аддзелаў (асабліваў Аршанскага), якія, паклаўшыся на самацёк, чакалі заявак і самі мер нізкіх ня прынялі. Гэта ўжо сыгналізавала аб дрэннай падрыхтоўцы да перавозак. Але належныя арганізацыі не зрабілі з гэта га патрэбнага выводу і падаваньне заявак на паражняк было надзвычай марудным і запяжным.

Зараз ёсьць другія выпадкі. Ёсьць выпадкі, калі сяўбовыя грузы прастоваюць на некаторых станцыях амаль па двое сутак (Калінкавічы і інш.), ка лі дарогі ня поўнасьцю падаюць вагоны пад нагрузку (Гомельскі раён).

Аналізуючы прычыны гэтых двух непаладкаў (перапрастой вагонаў і не падача іх), мы маем на ўвазе ў першую чаргу дрэнная скарыстоўваньне вагоннага парку, у прыватнасьці—надзвычай марудны абарот вагонаў нагрузкі на перавозках.

Асноўныя прычыны замаруджваньня абароту вагонаў таяцца перш за ўсё ў нездавальняючай рабоце на пагрузачных станцыях і дэпо. Дрэнная арганізацыя манэўраў, частая непадача паравозаў для манэўравых апэрацый—усё гэта прыводзіць да вялізарных прастояў вагонаў і асабліва з сяўбовымі грузамі. Зусім відавочна, што такая непаваротлівасьць і нераспарадчасьць прыводзіць да вялізнага скапленьня вагонаў (Калінкавічы) і да вялізнага прастою іх.

Зусім адмоўна адбіваецца на абароце вагонаў і дрэнная арганізацыя пагрузачна - разгрузачных работ. Вагоны прастойваюць пад пагрузкай і выгрузкай, як правіла, на процантаў 50 звыш нормы. А некаторыя станцыі (Полацак) дайшлі да таго, што вагоны з насеннай кукурузай трымалі пад выгрузкай па 6-8 дзён. Такія факты нельга расцэньваць інакш, як дзейнасьць, накіраваную на зрыў праграмы трэцяй бальшавіцкай сяўбы.

Абарот вагонаў з сяўбовымі грузамі непарыўна зьвязан з арганізацыяй руху, з якасьцю эксплёатацыі, з узроўнем працоўнай дысцыпліны. Таму ўкам плектаваньне дыспэтчарскага апарату, падвышэньне яго кваліфікацыі і барацьба за працоўную дысцыпліну—гэта тыя пытаньні, якія трэба неадкладна вырашыць і асабліва зараз, у момант адказнейшага часу па перавозках сяўбовых грузаў.

Трэба рэзка ставіць пытаньне аб тэхнічным нагляде за вагонамі, аб рабоце змазчыкаў, па віне якіх часта бывае гарэньне буксаў, а таму і адчэпка вагонаў з сяўбовымі грузамі (ст. Мормаль)

Як відаць побач з пытаньнямі перавозкі сяўбовых грузаў трэба ставіць пытаньне агульнай работы транспарту. З перавозкамі сяўбовых грузаў трэба зьвязаць узмацненьне работы службаў эксплёатацыі, руху, усіх чыгуначнікаў. Ударная перакідка сяўбовых грузаў павінна навучыць транспарт, як трэба арганізоўваць эксплёатацыю вагонаў як падвышаць іх карысную работу, як арганізоўваць бесьперабойны і чоткі рух.

У сувязі з перавозкай сяўбовых грузаў транспарт павінен рашуча перабудаваць работу сваіх асноўных зьвеньняў па-новаму, рашучым чынам замацоўваць гэтую перабудову і дамагацца наладжваньня ўсяе работы. Раз на заўсёды трэба пакончыць з таким зьявішчамі, калі грузы затрымліваюцца на станцыях. Асабліва важна, каб сельска-гаспадарчыя грузы адпраўляліся маршрутамі.

Трэба шырока ўжываць сацыялістычныя пуцёўкі, аб якіх мы пісалі ў па-за ўчарайшым нумары. Сацыялістычныя пуцёўкі—гэта радыкальны сродак да павялічэньня карыснай работы кожнага вагона, і, у першую чаргу, таго вагона, які ідзе з сяўбовымі грузамі.

На дэпутацкія групы вузлоў такса ма ўскладаюцца адказныя абавязкі. Яны павінны арганізаваць на станцыях, на вузлах свае кантрольныя пасты. Пасты павінны будуць сачыць за тым, як сяўбовыя грузы грузяцца і разгружаюцца, як гэтыя грузы адпраўляюцца ў месцы прызначэньня. Праз сваё ўмяшаньне ў кожную «дробязь» арганізацыі сяўбовых перавозак, праз канкрэтную дапамогу адпраўленьню вагону, дэпутацкія групы могуць і абавязаны не дапусьціць замаражваньня сяўбовых грузаў, здымаць са шляху рагаткі, якія яшчэ ставяцца дрэннай работай, няўменьнем многіх службаў арганізаваць перавозкі.

Вялікую ўвагу трэба аддаць перавозкам гаручага матар'ялу для трактараў.

Ня меншая адказнасьць за вынікі перавозак ускладаецца і на клієнтуру транспарту. Вузлы не заўсёды атрымліваюць дакладны і ясны адказ: адкуль, колькі і куды перавозіць сельска-гаспадарчыя грузы. Дрэннае плянаваньне перавозак, няўменьне скарыстаць паданы паражняк (Саюзхлеб), доўгія затрымкі вагонаў ля завадзкіх двароў (Гомсельмаш)—усё гэта, вельмі замаруджвае ход і прыводзіць да замаражваньня грузаў.

Яшчэ больш «капрысная» клієнтура ў воднага транспарту. Водны транспарт не атрымаў апэрацыйных заявак на перавозку сяўбовых грузаў. Водны транспарт некаторай «водабоязнай» клєнтурай проста ігнаруецца (асабліва каапэрацыйнымі арганізацыямі). Гэтай «вадабоязні» павінен быць пакладзены канец зараз-жа. Водны транспарт павінен неадкладна атрымаць заяўкі на перавозку і сяўбовыя грузы.

Прыстані павінны арганізаваць чоткую перавозку гэтых грузаў. Перавозка сяўбовых грузаў рачным флётам павінна быць зьвязана з разгорнутай работай па падвышэньні карыснай работы кожнага судна, з наладжваньнем работы воднага апарату, з правядзеньнем масавай работы сярод рабочых воднікаў і сярод камандзнага складу.

Перавозкі сяўбовых грузаў—палітычны экзамін для чыгуначнага і воднага транспарту. Кожны рабочы-чыгуначнік, кожны рабочы-воднік павінны ўсьвядоміць усю палітычную важнасьць несьпераборнага і бесчаргова га прасоўваньня грузаў, усю важнасьць пастановы ЦК КП(б)Б аб прасоўваньні сяўбовых грузаў без чаргі.

Адказны пэрыяд перавозкі сяўбовых грузаў павінен праходзіць у абстаноўцы масавага ўздыму, сацыялістычнага спаборніцтва і пралетарскай узаемадапамогі. Сацыялістычнае спаборніцтва павінна ўзьняцца на яшчэ і яшчэ больш высокую ступень. 1 мая—сьвята сацыялізму ў нас і сьвята рэвалюцыйнай барацьбы замежнага пралетарыяту—чыгуначнікі павінны сустрэць ударнымі перавозкамі сяўбовых грузаў, чоткай работай кожнага зьвена, кожнай адзінкі, выкананьнем усіх вымернікаў па транфінпляну.

І калі партыйныя і прафсаюзныя арганізацыі і гаспадарнікі чыгуначнага і воднага транспарту праз свае апэрацыйнае кіраўніцтва не забясьпечаць усяго гэтага, значыць яны не аплацяць пачэснага рахунку, прад'яўлена га ім усёй сацыялістычнай краінай, патрэбамі трэцяй бальшавіцкай сяўбы.



КАШЫРСКАЯ ЭЛЕКТРЫЧНАЯ СТАНЦЫЯ: НА ЗДЫМКУ: Першы савецкі турбагэнэратар у 50 тысяч квт. прысланай ударнай кашырскай будоўлі, рабочымі заводу «ЭЛЕКТРАСІЛА».

ЗА ГРАНІЦАЙ

Белагвардзейская правакацыя на КУ чыгунцы

ХАБАРАЎСК. 9-4. Дзейнасьць белых у Харбіне, якая за апошнія часы ажыдворна заціхла, як высьвятляецца цяпер, была накіравана на падрыхтоўку правакацыйных выступленьняў, што ставілі сабе мэтаю абвастрэньне адносін з мясцовымі кітайскімі і японскімі ўладамі. Харбінскія белагвардзейскія газэты і газэты, якія выдаюцца на рускай мове японцамі, мусіруюць сэнсацыйныя весткі аб арыпце палітычный некалькіх дасяткаў «тэрарыстаў», нібыта прыбыўшых з СССР. Па водле паведамленьня гэтых газэт, у арыштаваных «тэрарыстаў» пры вобыску знойдзены выбуховыя матэрыялы. Газэты ўзмоцнена распаўсюджваюць весткі аб рыхтуемым выбуху Сунгарыйскага маста, мэханічных майстэрняў, вадакачак і іншых пабудаваньняў. У сакраўднасьці-ж справа абстаіць наступным чынам. Паводле паўночных вестак, агентамі дарогі і вартай КУ чыгункі была выкрыта падрыхтоўка выбуху Сунгарыйскага маста на паўднёвай калеі УК чыгункі. На мосьце вартаўнікамі дарогі пры абходзе было выкрыта каля 2 пудоў дынаміту, закладзенага ў розных частках маста, зьвязаных электрычнымі правадамі. Злачынцы, якія падрыхтоўвалі выбух, пры палёненьні вартаўнікоў дарогі, з якіх адзін быў белагвардзеец, а другі савецкі грамадзянін, уцяклі, аднак вартаўнік—савецкі грамадзянін—быў злачынцамі забіты, вартаўнік-ж белагвардзейцу ўдалося ўцячы. Злачынцы дагэтуль ня знойдзены. Прынятымі адміністрацыяй дарогі мерамі выбуховыя матэрыялы выдалены з маста і нармальны рух на паўднёвай калеі адноўлены.

Сьледзтва па гэтай справе даручана кітайскай паліцыі, на службе якой знаходзяцца шматлікія белагвардзейцы, у руках якіх фактычна згрупавана на сьледзтва па гэтай справе. У Харбіне праведзены вобыскі і арышты сярод савецкіх грамадзян. Усё сьледзтва вядзецца ў тым напрамку, каб правакацыйнае выступленьне, арганізаванае белагвардзейцамі, прыпісаць савецкім грамадзянам, якія зьяўляюцца служачымі ці рабочымі КУ чыгункі.

Консульства—у кантору набору 19 арміі

ШАНХАЙ. 11-4. Японскае агенцтва «Прэс-Юніон» паведамляе аб тым, што салдаты 19 арміі і салдаты іншых частцей 1 красавіка захапілі японскае консульства ў будынку японскай бавоўнянай фірмы ў Чэнчжоу.

На захопленым будынку вывешаны плякат з надпісам: «Кантора па наборы салдат у 19 армію».

Японскае консульства пасласа ноту прагасту Хо-Чэн-Чуну (старшыня Хубейскага правінцыяльнага ўраду) з патрабаваньнем аб неадкладным выдаце салдат з захопленых памяшканьняў.

У абарону СССР і кітайскіх саветаў

НЬЮ ЁРК. 11-4. У Сан-Францыска перад будынкам японскага консульства пры ўдзеле 1000 рабочых адбылася дэманстрацыя пад лёзунгам абароны Савецкага саюзу і кітайскіх працоўных.

***

НЬЮ-ЁРК. 11-4. У Кетукі агенты прадпрыемцаў злавілі і жорстка зьбілі 5 студэнтаў і настаўнікаў Аркансаскага рабочага каледжу, якія спрабавалі расьледаваць умовы працы гарняцкоў і разьмеркаваць харчы сярод галадаючых рабочых.

Фашысцкая Польшча—на шляху да катастрофы

ВАРШАВА. 11-4. Імпэт Польшчы складаў у сакавіку 65.605 тыс. злотых, супроць 164 млн. злотых у сакавіку мінулага году, а экспарт 97.649 тыс. злотых, супроць 127 млн.

«Газэта польска» публікуе артыкул, пад загалоўкам «Перад новай фінансавай крызісу». Аўтар лічыць, што ўжываньне штучных угнаеньняў у сельскай гаспадарцы скарацілася на 2/3, што можа зьменшыць збор збожжа прыблізна на 1 млн. тон, а гэта складае ўвесь гадавы экспарт збожжа для Польшчы.

Апроч гэтага лётку канстатаваць зьмяншэньне мэханічнай апрацоўкі палёў. Павялічылася колькасьць запуш чаных, неапрацаванай глебы. Згодна прадпрыемцаў гаспадарчага канъюнктурнага інстытуту, у гэтым годзе ня хопіць запасаў жыта да новага ўраджаю. Становішча ва малочным і сьвіноўным рынку прыблізна такое ж. Аўтар прадбачыць магчымасьць імпарту збожжа ў Польшчу нават пры ня ўмоўнасьці абмежаваных пошлін і пры гэтым выказваецца за захаваньне гэтых пошлін (што зьяўляецца выгодным для буйных аграрыяў, якія маюць запасы мінулых год)

Баявыя дэманстрацыі рабочых у Варшаве

ВАРШАВА. 11-4. Учора ў Варшаве адбылася камуністычная дэманстрацыя, у якой, паводле газэтных паведамленьняў, удзельнічала звыш 800 чалавек. Паліцыя разганяла дэманстрантаў. Некалькі дэманстрантаў арыштавана.

У раёне капальняў сканцэнтравана войска

ПРАГА. 11-4. Становішча ў Паўночна-заходняй Багеміі, дзе адбываецца забастоўка гарнякоў, абвастрэнае. У забастоўчых раёнах сканцэнтравана войска і жандармерыя. Шахты ўласьнікі адмаўляюцца прызнаць пэнтральны забастоўчы камітэт, і спадзяюцца дагаварыцца аб скарачэньні забастоўкі з сацыял-фашысцкімі бюра кратамі на нарадзе, якая назначана на 13 красавіка ў Празе. На 5 канфэрэнцыях гарнякоў аднагодна прынята прапанова Цэнтральнага забастоўчага камітэту абвясьціць на 13 красавіка ўсеагульную забастоўку ў Паўночна-заходняй Багеміі.

Гаміндан манэўруе

НАНКІН. 11-4. На вячэрнім паседжаньні надзвычайнай канфэрэнцыі ў Лоянг па пытаньні аб абароне прынята наступная рэзалюцыя:

1. Урад пазбягае скарыстаць ваенныя і дыпляматычныя сродкі для таго, каб супраціўляцца да канца сукроць кітайны, якая спрабуе разбурыць палітычную незалежнасьць, а таксама тэрытарыяльную адміністрацыйную цэласьць Кітаю. Ніякая згода, якая супярэчыць вышэйсказанаму, ня можа быць падпісана.

2. Народ, незалежна ад партыі і поглядаў, павінен аказваць усякае падтрымліваньне ў ажыцьцяўленьні ўрадам палітыкі нацыянальнай абароны.

Плёткі аб уцёках ген. Ма

ШАНХАЙ. 11-4. Японскія крыніцы абвяргаюць паведамленьне аб тым, што генэрал Ма, нібыта, выехаў у СССР, а таксама аб тым, што ім узьняты паўстаньне супроць новага маньчжурскага ўраду. Гэтыя крыніцы заявяляюць, што генэрал Ма з прычыны чэсовай хваробы ня можа зьвярнуцца ў Хэйлун-Цзян.

Рэпэтыцыя

Японскі генэральны консул у Мукдэне Марысіма дагаварыўся з консуламі іншых дзяржаў у сувязі з маючым быць прыбыцьцем камісіі Лігі нацый, каб яны: „Не скажалі японскіх пазіцый у Манчжурыі".

(З газэт).

На Жэнэўскай канфэрэнцыі па разбраеньні

Супярэчнасьці паміж Францыяй ПАЗШ абвастраюцца

Адложаны ... 12-IV. Адкладаньне «работ» комітэту ... па «разбраеньні» пачало ... паседжаньнем генэральнай камісіі. Першае-ж паседжаньне прайшло пад знакам досыць рэзкай сутычкі французкіх і амэрыканскіх інтарэсаў, прычым амэрканскі пункт гледжаньня быў падтрыманы дэлегатам Англіі Саймонам.

Паседжаньне генэральнай камісіі адкрылася прамовай старшыні канфэрэнцыі Гендэрсона, які падагульваючы «карысныя вынікі» першага пэрыяду канфэрэнцыі, заявіў, што зараз на чарзе абгаварэньне прынцыпаў і мэтадаў скарачэньня ўзбраеньняў. Гендэрсон напомніў аб прынятым 15 сакавіка рашэньні, паводле якога генэральная камісія павінна рабіць паседжаньні датуль, пакуль ня прыдзе да прынцыповых рашэньняў, якія дазваляюць прадоўжваць работы тэхнічным камісіям.

У спрэчках першым выступіў дэлегат ПАЗШ Гібсон. Гібсон пачаў з зазначэньня, што большасьць прапаноў, якія ўносяцца на канфэрэнцыю, адбіваюць клопаты аб тым, як ажыцьцявіць абмежаваньне і скарачаньне ўзбраеньняў, не наносячы гэтым самым стратэгіі нацыянальнай безапасьнасьці. Гэтыя апаскі, паводле думкі Гібсона, адбіваюць страх перад магчымасьцю варожага нападу і апаску, што сродкі для яго адбіцьця могуць аказацца недастатковымі. Таму Гібсон лічыць, што пакольці агрэсыўнымі відамі ўзбраеньняў, якія палегчаюць напад, зьяўляюцца танкі, палявая цяжкая артылерыя і газы, дык забарона ўжываньня іх узмацніць упэўненасьць у бясьпецы. Гібсон падкрэсьліў, што амэрыканская делегацыя намерана ня ставіць пытаньне аб забароне наступальных відаў, зброі, ва ўсёй шырыні, бо, «вопыт паказаў шкоду патрэбмінаваньня вельмі многіх праблем адразу і што таму трэба згрупавацца на найбольш вострай частцы праблемы бясьпекі, зьвязанай з сухапутнай вайной».

Гібсон унёс рэзалюцыю, у якой зазначаецца, што апаска варожых нападаў выклікаецца і абвастраецца існаваньнем наступальных відаў зброі і таму іх зьніжэньне ня толькі забясьпечыць скарачэньне ўзбраеньняў, але ўзмацніць бясьпеку. Рэзалюцыя прапануе даручыць камісіі па сухапутных ўзбраеньнях выпрацаваць і прадставіць плян зьніжэньня танкаў і палявых гармат больш 150 і 155 мм. і забароны ўжываньня газаў і даручыць палітычнай камісіі выпрацаваць формулу абавязацельства аб забароне ўжываньня ў вайне паказаных сродкаў.

Дэлегат Англіі Саймон падтрымаў Гібсона, зазначаўшы, што англійскі ўрад яшчэ ў пачатку канфэрэнцыі выказаўся за забарону раду наступальных відаў зброі, а таксама лічыць, што спачатку неабходна скарацінь сухапутныя ўзбраеньні. Дэлегат Германіі Надольны заявіў, што задача канфэрэнцыі па разбраеньні ня толькі ў абмежаваньні, але і скарачэньні ўзбраеньняў. Гэтае скарачэньне павінна быць пагоджана 8-м арт. статуту Лігі нацый і даведзена да максымальнага ўзроўню. Надольны прапануе абгаварыць амэрыканскі праект у сувязі з іншымі прапановамі, унесенымі раней, ў прыватнасьці, з германскімі і італьянскімі як з тымі, якія «больш далёка ідуць і ахапляюць і іншыя віды наступальнага ўзбраеньня».

Надольны падкрэсьліў, што германская дэлегацыя ня была-б задаволена, калі-б канфэрэнцыя абмежавалася прыняцьцем прапаноў Гібсона. Выступленьне Гібсона сустрэла рэзкае супраціўленьне з боку Тард'е. Тард'е заявіў, што «французкія прапановы, унесеныя на канфэрэнцыі, ідуць значна далей прапановы Гібсона, бо яны прадугледжваюць скарачэньне таксама бамбардыровачнай авіяцыі, лінкораў больш 10,000 тон і буйных падводных лодак». «Апроч таго, падкрэсьліў Тард'е, французкія прапановы зьвязваюць гэтыя забароны стварэньнем кантролю і ўстанаўленьнем санкцыі супроць нападаючага боку ў духу нацый». «Амэрыканская прапанова—працягвае Тард'е,—накіравана выключна супроць сухапутных узбраеньняў і тым самым супярэчыць незьменнаму французскаму тэзісу і ўзаемазалежнасьці розных відаў узбраеньняў».

Тард'е заявіў, што Францыя мае як сухапутныя, так і морскія граніцы і калёніі, значыцца яна зацікаўлена ва ўсіх відах узбраеньня. Тард'е далей заявіў, што амэрыканская прапанова ня поўная па сваім ахопе і недастаткова, бо не зьмяшчае момантаў санкцыі і кантролю і таму трэба перадаць прапанову Гібсона на бюро канфэрэнцыі для ўстанаўленьня працэдуры абгаварэньня і ўзаемнай сувязі з усімі прапановамі, якія закранаюць якасныя абмежаваньні ўзбраеньняў, г. зн. італьянскімі, германскімі і французскімі. Італьянскі дэлегат Кабалеро спасаўся на нядаўна ўручаны італьянскім урадам мэмарандум, на якім прынцыпы якаснага абмежаваньня ўзбраеньняў разьвіты поўнасьцю. Такім чынам прапанова Гібсона можа, паводле думкі Кабалеро, разглядацца ў рамках італьянскага мэмарандуму.

Выступіўшы ў другі раз Гібсон заявіў, што ён згодны на тое, каб даручыць бюро канфэрэнцыі ўстанавіць працэдуру абгаварэньня пытаньняў і зноў падкрэсьліў, што сваёй прапановай ён сьвядома імкнуўся ахапіць толькі частку агульнай праблемы.

У другі раз выступіўшы Тард'е, ня казаўшчыся за перадачу прапановы Гібсона ў бюро канфэрэнцыі, падкрэсьліў, што «працэдурныя пытаньні часта на справе зьяўляюцца істотнымі пытаньнямі, бо зараз ў нязгодзе ці дзьве тэндэнцыі: адна—у духу даваенных гаагскіх канфэрэнцый, якая імкнецца забараніць паасобныя віды ўзбраеньняў і другая—французкая, якая імкнецца да розных рашэньняў у духу Лігі нацый». У выніку спрэчак рэзалюцыя Гібсона перадана на абгаварэньне бюро канфэрэнцыі. Пасьля першага паседжаньня германскай камісіі па разбраеньні Гібсон прынёс прадстаўнікоў друку. Адказваючы на розныя пытаньні, Гібсон, між іншым, катэгарычна заявіў, «ніякі між народны кантроль для Амэрыкі не прыймальны».

Саймон у гутэрцы з прадстаўніком друку заявіў, што «да паседжаньня генэральнай камісіі ён нічога ня ведаў аб прапанове Гібсона». Саймон зазначыў, што англійскі ўрад сам нядаўна абгаварваў аналёгічную прапанову і ён цалкам згодзен з прапановай Гібсона».

Разгарнуць масавую работу па датэрміновым выкананьні фінпляну

Усім Райфа і Гарфа

Разгорнутыя тэмпы сацыялістычнага будаўніцтва абавязваюць фінансавую сыстэму датэрміновае выкананьне фінпляну.

Прапазую разгарнуць баявую апэрацыйную масавую і грамадзкую работу па выкананьні 50 проц. фінпляну II кварталу да 1-га мая

Аб прынятых мерах паведаміце да 15-га красавіка.

НКФ БССР Хацкевіч

Узятых тэмпаў у барацьбе за фінплян не здаваць

БССР атрымала пераходны чырвоны сьцяг

За выкананьне пляну мабілізацыі сродкаў першага кварталу Калегія Наркамфіну СССР і ЦК саюзу фінбанкаўскіх работнікаў прысудзілі БССР пераходны чырвоны сьцяг.

Гэта абавязвае партыйныя, савецкія, камсамольскія і прафсаюзныя арганізацыі яшчэ з большай энэргіяй і энтузіязмам разгарнуць барацьбу за выкананьне фінпляну—аднэй з цэнтральных задач народна-гаспадарчага пляну чацьвертага заключнага году пяцігодкі.

Па ўсіх гарадох і раёнах, па ўсіх сельсаветах, прадпрыемствах, саўгасах, калгасах, МТС павінна быць узьнята вялікая хваля сацыялістычнага спаборніцтва і ўдарніцтва.

Пад сьцягам міжраённага сацыялістычнага спаборніцтва забясьпечым 50 процантнае выкананьне фінпляну II кварталу да 1 мая і датэрміновае выкананьне ўсяго пляну да 10-15 чэрвеня.

Уцягнем у рады ўдарнікаў фінпляну новыя дзесяткі тысяч рабочых і работніц, калгасьнікаў і калгасьніц.

Ліквідуем прарывы на асобных вучастках фінпляну. Шляхам сацыялістычнага грамадзкага буксіру выцягнем з глыбокага тылу адстаючыя раёны: Полацкі, Горацкі, Нараўлянскі, Брагінскі, Шклоўскі, Калыльскі, Петрыкаўскі, Кармянскі, Ельскі, Жлобінскі, Чачэрскі, Вушацкі, Крычаўскі, Бялыніцкі, Гарадоцкі, Уваравіцкі, Веткаўскі, Бярэзінскі, Клімавіцкі, Лельчыцкі, Бягомльскі, Расонскі, Асьвейскі, Бешанковіцкі і Старадарожскі.

Узмоцнім тэмпы—і гэтым утрымаем пераходны сьцяг.

т. ПОЗІНА.
Ударніца фінфронту—рэдактыя шэйнай фэкі Камінтэрн (Гомель).

Датэрмінова выканаць плян II кварталу

Пад кіраўніцтвам КП(б)В, разгортваючы масавую работу сярод рабочых, калгасьнікаў, бедняковаў і сераднякоў—адказнасьнікаў, Лёзьненскі раён перавыканаў плян мабілізацыі сродкаў першага кварталу і прыступіў да выкананьня фінпляну другога кварталу.

Выклікаем на сацыспаборніцтва Сураскі раён на датэрміновае выкананьне фінпляну другога кварталу.

Арбітрам вызначаем газэту «Савецкая Беларусь».

Старшыня РВК ЖОГАЎ.
Райфа АРОНАЎ.

ЦК КП(б)Б, СНК, НКФ БССР, рэдакцыям газэт „Савецкая Беларусь" і „Зьвязда"

Трэці зьлёт ударнікаў фінфронту Лёзьненшчыны абавязваецца выканаць фінансавы плян II кварталу на 50 проц. да 1-га мая і на 100 проц. да 10-га чэрвеня.

Узятыя тэмпы не здамо.

Выклікаем на міжраённае сацыспаборніцтва Сураскі раён.

Прэзыдыум зьлёту

Камбінат „Камінтэрн" вышаў з прарыву

Барысаў. (Наш кар.). На Барысаўскім камбінаце «Камінтэрн» у галіне мабілізацыі сродкаў быў вялікі прарыў. Так па фізычных укладах у апошнядкасы кантрольны плян быў выкананы на 20 сакавіка ўсяго на 1,6 проц.

Для ліквідацыі гэтага прарыву партыйныя, камсамольскія і прафсаюзныя арганізацыі аполітнюю дакладу сакавіка абвясьцілі штурмовай.

Дзяўючы сапраўды бальшавіцкай рабоце ў мабілізацыі сродкаў, прарыў зараз ліквідаваны і кантрольнае заданьне на 31 сакавіка камбінатам выканана на 100 проц.

Вялікую ініцыятыву і актыўнасьць праявілі рабкоры камбінату. На іх ініцыятыве разгарнуўся масавы рух за ўнясеньне «сацыялістычнага чырвонца» тэрмінам ня менш, чым на паўгода.

Арганізацыі камбінату абвязваюцца ў далейшым замацаваць дасягнутыя посьпехі і ўзяць на буксір адстаючыя па фінпляне прадпрыемствы Барысаўшчыны.

С.

Лепшым ударнікам фінфронту—прэміі

ПУХАВІЧЫ. 3-га красавіка адбыўся раённы зьлёт ударнікаў фінфронту. На зьлёце прысутнічала 45 чалавек. Лепшыя ўдарнікі фінфронту прэм'яваны: загадчык апчадкасы в. Блужа—тав. Міклуш, які дабіўся выкананьня квартальнага пляну на 123 проц., загадчык і кампралёр Дукорскай апчадкасы. Райкому камсамола выдана прэмія ў 1000 руб. Таксама прэм'явана калгасьніца Дукорскага сельсавету Гулю Пірскі, якая зьлётам адзначана як сапраўдная ўдарніца фінфронту. Тры калгасы Дудзіцкага сельсавету прэм'яваны на суму 350 р. і сельскагаспадарчымі машынамі.

Атрымалі «прэміі» і зрыўшчыкі пляну мабілізацыі сродкаў—па рагожным парфэлі—Рудзенская і Марыла-Горская апчадкасы і рагожны сьцяг—Пяражырскі сельсавет. (Велта).

Линейная калибровочная мишень LRT-BE4-V2

Генэральная праверка гатоўнасьці да сяўбы

САУГАСЫ МОГУЦЬ і ПАВІННЫ ПАКАЗАЦЬ, ПРЫКЛАДЫ БАРАЦЬБЫ

ЗА БАЛЬШАВІЦКІ УРАДЖАЙ

14 красавіка

Саўгасы—сацыялістычныя фабрыкі ў сельскай гаспадарцы, апорныя пункты сацыялістычнай перабудовы вёсні. Яны павінны быць прыкладам у правядзеньні ўсіх гаспадарча-палітычных кампаній.

У адносінах правядзеньня веснавой пасеўнай кампаніі гэта азначае, што кожны саўгас павінен паказаць узор бальшавіцкай падрыхтоўкі і правядзеньня сяўбы на аснове апошніх дасягненьняў агратэхнікі. І ня толькі па баявому падрыхтавацца і правесьці сяўбу самім, але дапамагчы ў гэтай адназьнейшай рабоце суседнім калгасам і працоўным аднаасобнікам.

Між тым, матар'ялы з месц, якія мы сёньня друкуем, гавораць аб тым, што некаторыя саўгасы сустракаюць сяўбу зусім непадрыхтаванымі, хоць маюць для гэтага ўсе магчымасьці. Прыклад як не павінен рыхтавацца да сяўбы паказвае саўгас імя Войкава (Кармянскі раён). Ня гледзячы на тое, што саўгас Войкава ў гэтым годзе значна паішырае пасеўную плошчу—рамонт с-г інвэнтара праходзіць вельмі дрэнна. Саўгас імя Войкава яшчэ не зьяўляецца перадавіком, ня стаў сапраўдным прыкладам для блізкэйшых калгасаў. Ня гледзячы на тое, што праз неналькі дзён пачнуцца палявыя работы, саўгас не гатоў да сяўбы.

Генэральная праверка гатоўнасьці да сяўбы павінна ўскрыць усе прарывы ў падрыхтоўцы да сяўбы і па саўгасах. Трэба праверыць ці праведзены добраякасны рамонт с-г інвэнтара і машын, ці забясьпечаны саўгасы ра бочай сілай, як праходзіць вывазка гною і завоз мінэральных угнаеньняў.

Мабілізацыяй мас рабочых саўгасаў і калгасьнікаў дамагчыся, каб саўгасы сяўбу спаткалі і правялі па-бальшавіцку.

Дор бальшавіцкай работы

ПЕТРЫКАЎ. Саўгас імя Калініна поўнасьцю падрыхтаваўся да веснавой сяўбы. Насеньне поўнасьцю засыпана і ачышчана. Плян па вывазцы гною, торфу і мінэральных угнаеньняў поўнасьцю выкананы.

Рамонт с.-г. машын і інвэнтара закончаны. Трактары гатовы да выхаду ў поле.

Саўгас забясьпечаны ў дастатковай колькасьці рабочай сілай. На патрэбную сэзонную рабочую сілу заключаны дагавары.

Уся рабочая сіла ў саўгасе падзелена на брыгады. Да кожнай брыгады прымацаваны адпаведная колькасьць с.-г. машын ,інвэнтара і коняй.

Саўгас уключыўся ва ўсебеларускае сацспаборніцтва на лепшае правядзеньне веснавой сяўбы і па аказань ні лепшай дапамогі ў выкананьні вес навой сяўбы ваколічным калгасам і аднаасобнікам.

Прыбыль.

Саўгас дапамагае калгасам

ЧАВУСЫ. Саўгас «Ялава» па ўдар наму падрыхтаваўся да веснавой сяўбы. Насеньне поўнасьцю засыпана і ачышчана. Рамонт с.-г. інвэнтара і збруі закончаны. На кожнага каня ёсьць па 2 камплекты вупражы і адным плузе.

Рабочыя саўгасу падзелены на брыгады. Усяго ў саўгасе ёсьць 6 брыгад, з якіх адна трактарная, тры—плугароў, адна—скарадзьбітоў і адна па палівае насеньня.

Сёлета саўгас значна пашырае засеўную плошчу. Пры абгаварэньні вытворча-фінансавага пляну рабочыя саўгасу зьясунулі сустрачны плян сяўбы, паводле якога засеўная плошча пашырэцца на 100 проц. у параўнаньні з мінулым годам.

Саўгас накіраваў у падшэфныя яму калгасы «Юны Камунар», Лагаўскага сельсавету, і «Надзея», Сунчаўскага сельсавету, брыгады па правядзеньні рамонту с.-г. інвэнтара і вупражы, а таксама і для складаньня вытворчых пляноў.

Гэтых посьпехаў у падрыхтоўцы да сяўбы саўгас дамогся дзякуючы правільнаму кіраўніцтву партячэйкі і рэалізацыі шасьці гістарычных умоў тав. Сталіна.

Вопыт работы саўгасу «Ялава» трэба перанесьці ва ўсе саўгасы раёну.

Захарэнка.

Штодзёнка дапамагла

УВАРАВІЧЫ. Па ініцыятыве штодзённі саўгас «Уваравічы» ўдарна разгарнуў актыўную падрыхтоўку да веснавой сяўбы. На старонках штодзённі «Ударнік бальшавіцкіх тэмпаў» была завострана ўвага на ўсе слабыя вучасткі работы.

Трыкутнік саўгасу мабілізаваў вакол пытаньня падрыхтоўкі да сяўбы ўсю рабочую масу. Паміж паасобнымі цэхамі было разгорнута сацспаборніцтва на лепшае правядзеньне падрыхтоўкі.

Рамонт с.-г. інвэнтара ў саўгасе поўнасьцю закончаны. Ударна праводзіцца работа па засыпцы насенных фондаў.

Рабочыя саўгасу падзелены на брыгады. Складзен вытворчы пасеўны плян, які даведзен да кожнага цэху, кожнай брыгады і кожнага рабочага ў паасобку.

В. Русовіч.

Своячасова адгрузіць мінэральныя ўгнаеньні

МСЬЦІСЛАЎЛЬ. (Наш спэцкор). Па водле дагавору з беларускім аддзаленьнем «Мінудгнаеньня» раён павінен атрымаць да веснавой пасеўкампаніі 216 тон фасфарыту, 126 тон калійнай солі, 1,5 тоны азоцістых і 126 тон суперфасфату.

На сёньняшні дзень, з прычыны абуючай недбайнасьці «Мінудгнаеньня», Мсьціслаўшчына не атрымала яшчэ ні водной тоны з пералічанага.

Ня гледзячы на тэлеграмы і асабістыя паездкі работнікаў Райкалгасасэзу і МТС—справа ня зрушана з месца. Пакуль што ёсьць толькі 600 тон вапны і каля 200 тон фасфарыту, якія неадкладна трэба размеркаваць па бліжэйшых калгасах.

Неабходна напярэдзіць паўтарэньні леташняга выпадку, калі 9 вагонаў угнаеньня прыйшлося, з прычыны бездарожжа і адсутнасьці транспарту, вы грузіць проста пад дождж.

Беларускае аддзяленьне «Мінудгнаеньня» паўвінна неадкладна закончыць адгрузку мінэральнага ўгнаеньня раёнам.

Юр. Лявонны.

Прыступілі да сяўбы перадавыя калгасы Случчыны

СЛУЦАК. 13-4 (Па тэлефоне ад нашага кар.). Перадавыя калгасы прыступілі да сяўбы. КАЛГАС ІМЯ КАРЛА ЛІБКНЭХТА, Амговіцкага сельсавету, 12 красавіка вышаў у поле. Працавала 9 пар коняй, узарана пад яравую пшаніцу 5,5 га, якія сёньня засяваюцца. Калгас імя МОПР'у гэтага-ж сельсавету таксама сёньня вышаў у поле; вышаў у поле і калгас «Чырвонае Харошава».

Калгасы Прошчынскага сельсавету рыхтуюцца да выхаду ў поле 15 красавіка.

ХАЎКІН.

Правяраюць датоўнасьць да сяўбы.

Дрэннае кіраўніцтва—дрэнная падрыхтоўка

Карма. (Ад наш. спэцкора). У саўгасе імя Войкава зусім не адчуваецца падрыхтоўка да веснавой сяўбы. Ня гледзячы на тое, што ў параўнаньні з мінулым годам значна павялічылася плошча пасеву, трактарны парк і конская цягавая сіла адпаведна не павялічыліся.

Трактары да сяўбы не падрыхтаваны. Рамонт, праведзены ва Ўраравіцкай майстэрні, ня быў праверэны ў часе прыёму трактароў, і зараз аказалася, што якасьць яго зусім дрэнная. Пасьля вальнютня. У саўгасе не [illegible] рашыла ўважліва абыходзіцца з машынамі, а выйшку гэтага трактары часта псуюцца. У даглядзе за коньмі таксама ёсьць шмат недахопаў. Ёсьць патрэба, што частка коняй, патрэбных для палявых работ, ня будзе здольна працаваць. Трэба неадкладна наляпіць даглядзе за коньмі—скарыстаўшы для гэтага ўсе кармовыя рэсурсы, якіх ёсьць у саўгасе дастаткова.

Дрэнную падрыхтоўку да сяўбы трэба тлумачыць дрэнным кіраўніцтвам. У саўгасе недалюбліваюць самакрытыку.

— Брэшаш як сабака,—гаварыў за гадзінк бровару Арцюшэўскі, рабочаму, які ўносіў капітоўную прапанову для паляпшаньня вытворчасьці на бровару.

Саўгасная насьцянгазэта не змагла ацца за падрыхтоўку да сяўбы. Яна разважае наогул і нават ня бачыць ударнікаў, якія ў саўгасе ёсьць, а за наўпяе толькі чорную дошку; для заняпеньня-ж на чырвоную дошку не знаходзіць нікога. А ў саўгасе ёсьць даволі моцны кадр рабочых, якія працуюць у ім спачатку рэвалюцыі, перанесьлі труднасьці разрухі і зараз ўсімі сіламі змагаюцца за ўмацаваньне вытворчасьці гаспадаркі. Прэм'яльныя фонды для лепшых ударнікаў ляжаць у кладоўцы, палова з іх пашсавана мышамі. Рабачком лічыць гэта нармальным, лічыць нармальным і тое, што на саўгасе не разгорнута сацспаборніцтва і ўдарніцтва, што ў саўгасе не рэалізуюцца 6 гістарычных паказань няў тав. Сталіна.

Возьмем хоць-бы пытаньне кадраў. У саўгасе імя Войкава арганізаваны саўгасвуч, але адміністрацыя і рабачком не аказваюць яму ніякай дапамогі. Харчаваньне і бытавыя ўмовы вучняў дрэнныя. Між тым, ёсьць магчымасьць нармальна арганізаць інтэрнат, дабіцца добрай якасьці абедаў.

Зараз у саўгасе праводзіцца дасьледваньні па сіласаваньні брагі, якая псуецца пасьля некалькіх дзён выхаду з бровару. Для дасьледваньня патрэбна адна тона макухі, і райспаб не пакланяцца аб тым, каб ае даць. Саўгас ня выдае для кароў, над якімі праводзіцца досьлед, аднародных кармоў і гэтым вопыт зрывае. Нават ня могуць арганізаваць так работы, каб кароў, над якімі праводзіцца вопыт, даіць на 3 разы ў дзень.

Саўгас імя Войкава яшчэ не завяваў начэснага права быць перадавіком у сацыялістычным сэстары, ня стаў сапраўдным прыкладам для бліжэйшых калгасаў. Ня гледзячы на тое, што праз некалькі дзён пачнуцца палявыя работы, саўгас яшчэ не гатоў да сяўбы.

Трэба заняцца пытаньнем аздараўленьня кіраўніцтва ў саўгасе. Саўгасу патрэбен добры гаспадар, саўгасу па трэбна добрае апэратыўнае кіраўніцтва з боку раёну і партячэйкі на месцы. Насьляховая падрыхтоўка да сяўбы можа быць толькі тады, калі ўвесь рабочы калектыў будзе мабілізаваны на работу, калі будуць мабілізаваны ўсе сродкі для таго, каб 3-ю бальшавіцкую вясну правесьці сапраўды паўдарнаму.

Слова за Кармянскім райкомам партыі. Ён павінен узмацніць апэратыўнае кіраўніцтва саўгасам. Слова так сама за рабоча-сялянскай інспэкцыяй, за пракуратурай.

Ад таго, як хутка будуць прыняты меры і як хутка будуць зьнішчаны ўсе перашкоды ў рабоце саўгасу, будзе залежаць посьпех падрыхтоўкі да сяўбы. будзе залежаць посьпех усёй работы ў саўгасе імя Войкава.

В. П.

Генэральная праверка гатоўнасьці да сяўбы

Партыйнае будаўніцтва

БАЛЬШАВІЦКІ АДПОР

усякім скажэньням у арганізацыі калгаснай вытворчасьці

Вынік адсутнасьці партыйнага кіраўніцтва

СЯННО. У калгасе імя Карла Маркса (Сідарвіцкі сельсавет) работа зусім не арганізавана. А 10 гадзіне раніцы ў памяшканьне праўленьня пачынаюць зьбірацца калгасьнікі. У гадзін 11 выходзіць старшыня калгасу Курылёнак і пачынае «таргавацца»—«што хто сёньня будзе рабіць». Урэшце а палове дванаццатай калгасьнікі прыступаюць да працы.

Брыгады ў калгасах ня створаны. Для «адводу вочай» зроблены нейкія сьпісы брыгад і вылучаны брыгадзіры, але на справе ніякіх брыгад няма, як няма і зьдзельшчыны. Працоўныя кніжкі калгасьнікам ня выданы і працадні запісваюцца па розных паперках і блёкнотах, таму няма празьлінага ўліку праробленай працы кожным калгасьнікам. Зусім ня ўлічваецца якасьць працы.

Падрыхтоўчая работа да сяўбы ў калгасе ў такім становішчы, што ў тэрмін калгас сеяць выйсьці ня зможа.

Што-ж у гэты час робіць партыйная ячэйка Сідарвіцкага сельсавету.

За ўвесь час існаваньня калгасу імя Карла Маркса ячэйка ні разу не паставіла ні на бюро, ні на сходзе пытаньне аб становішчы гэтага буйнога калгасу, які арганізаваны яшчэ тэрыторыі чатырох вёсак. З калгасьнікамі не прапрацаваны нават апошнія пастановы партыі і ўраду аб арганізацыйна-гаспадарчым умацаваньні калгасаў.

Зараз Сідарвіцкая партячэйка пакінна неадкладна і рашуча павярнуцца тварам да арганізацыйна-гаспадарчага ўмацаваньня калгасаў. Трэба пачаць з абгаварэньня становішча калгасу з калгасным актывам, якога там ёсьць вялікая колькасьць, і па гэты актыў абапірацца ва ўсёй штодзённай рабоце на створаныя сталых вытворчых брыгад. Патрэбен вельмі чулы падыход да падбору брыгадзіраў, бо гэта адыгрывае рашаючую ролю ва ўсёй рабоце брыгад. Ліквідацыя абязьлічкі ўнутры брыгад, сапраўднае ўвядзеньне зьдзельшчыны і яе ўліку, перанесьненьне цэнтру ўсёй цяперашняй работы на падрытоўцы да сяўбы ў брыгады—вось тыя шляхі, якімі партячэйка дабіецца пералому ва ўсёй рабоце калгасу.

К-н.

Бальшавіцкія прыклады барацьбы за ўмацаваньне калгаснай вытворчасьці

СІРОЦІНА. Калгас «Заря свабоды» (Лаўжанскі сельсавет) уключыўся у конкурс «Правды»! 8-га сакавіка і з таго часу ўся работа па падрыхтоўцы да сяўбы, па арганізацыйна-гаспадарчым умацаваньні калгасу вядзецца пад знакам выкананьня ўмоў конкурсу.

У калгасе створаны сталыя брыгады і вельмі добра расстаўлены сілы па брыгадах. Брыгадзіры вылучаны самыя лепшыя калгасьнікі ўдарнікі. Усе падрыхтоўчыя работы да сяўбы вядуцца па-брыгадна. Поўнасьцю выгнана абязьлічка ў даглядзе за коньмі. Брыгада нясе адказнасьць за даручены ёй інвэнтар і коні, у брыгадзе таксама за кожным калгасьнікам замацаваны пэўны інвэнтар, або коні, за якія ён адказвае.

Дзякуючы такой правільнай расстаноўцы сілы і поўнай ліквідацыі абязьлічкі, падрыхтоўка да сяўбы ў калгасе скончана. Інвэнтар адрамантаваны: прыведзены ў поўную гатоўнасьць 22 плугі, 21 барона, 20 хамутоў і інш. інвэнтар. Насеньфонд і страхфонд поўнасьцю засыпаны і адсартаваны. Аўса засыпана 250 пуд., ячменю 295 пудоў, ільнасемя 216, бульбы 1500 пудоў і інш.

Кармамі жывёла як аграмадзжанага, так і не аграмадзжанага стада на час палявых работ поўнасьцю забясьпечана. Створаны фуражны і недатыкальны фонды.

Усе работы добра і своячасова калгасам зьяконваліся дзякуючы таму, што ўся работа вядзецца пад знакам сацыялістычнага спаборніцтва і ўдарніцтва. Лепшыя ўдарнікі калгасу, арганізатары калгаснай вытворчасьці—Кавалёў Г., Захараў І., Сыпрыдаў С., Аўсянікаў В. і іншыя пад кіраўніцтвам партячэйкі сваім прыкладам вялі за сабой усю масу калгасьнікаў і таму калгас з посьпехам справаўся з усімі гаспадарча-палітычнымі кампаніямі і добра падрыхтаваўся да трэцяй бальшавіцкай сяўбы.

Брыгада па праверцы падрыхтаванасьці калгасу да сяўбы:

А. Муша, Ушакоў Мікіта, Матузаў Ф.

Рашуча ўдарыць па „лявацкіх" скажэньнях дырэктыў партыі

Работнікі Аршанскага райкалгасасэзу не зразумелі сутнасьці пастановы партыі аб арганізацыйна-гаспадарчым умацаваньні калгасаў прыкладную ліквідацыю абязьлічкі, укараненьне зьдзельшчыны, арганізацыі сталых брыгад і г. д. Замест разгортваньня сапраўды бальшавіцкай работы па рэалізацыі дырэктыў партыі ў калгасным будаўніцтве, яны захапіліся ўзбуйненьнем калгасаў і ўтварэньнем калгасаў-волатаў.

Так, па Брадзечынскім сельсавеце аб'ядналі 5 калгасаў у адзін волат на плошчы каля 2,5 тыс. га, з радыусам да цэнтру на 4-5 клм. Злучаны па ступньні калгасы: «Ленінскі шлях»—22 гаспадаркі, «Наша атрада», в. Брадзечыны—60 двароў, «МОПР», в. Есінава-Чырвоная—40 двароў, «Чырвоны сьцяг», в. Есінава-Зямянскае—35 двароў і «Пераможнік», в. Бабічы—40 двароў у адзін калгас пад назвай «Ленінскі шлях». Абранае праўленьне на сходзе ўнаўнаважаных нічога пра робіць. Старшыня волату тав. Сінчанка разьяжджае па фермах, і калі ў яго запыталіся, што робіцца па падрыхтоўцы да веснавой сяўбы, дык ён адказвае:

— Ня ведаю, вось зьбяру па вёсках весткі, пасьля будзем гаварыць.

У выніку, падрыхтоўка да веснавой сяўбы зрываецца, брыгады ня складзены, пляны да калгасьнікаў не даведзены, насеньне не адсартавана, няма сталага ўліку інвэнтара, рабочых коняй і г. д.

Гэткае-ж становішча ў Кугляеўскім сельсавеце і ў іншых. Аршанскі райком КП(б)Б абавязаны неадкладна заняцца гэтым пытаньнем і рашуча ўдарыць па «лявацкіх» скажэньнях дырэктыў партыі.

Лінкевіч.

М. Канаплін і Л. Рудзіцкі

Праз узмацненьне саветаў да бясклясавай грамады

(Да праекту новага закону пра гарсаветы БССР)

У сваёй гістарычнай пастанове XVII партыйная канфэрэнцыя вызначыла вялізарныя задачы, якія стаяць перад нашай пралетарскай дзяржавай. Канфэрэнцыя адзначыла, што «асноўнай палітычнай задачай другой пяцігодкі зьяўляецца канчатковая ліквідацыя капіталістычных элемэнтаў і клясаў наогул, поўнае зьнішчэньне прычын, якія парождаюць клясавую розьніцу і эксплёатацыю, перамаганьне перажыткаў капіталізму ў эканоміцы і сьвядомасьці людзей, ператварэньне ўсяго працоўнага насельніцтва краіны ў сьвядомых і актыўных будаўнікоў бясклясавага сацыялістычнага грамадзтва».

Зусім зразумела, што гэтыя задачы, якія ўпяршыню ў гісторыі чалавецтва, пралетарыят СССР канчатковa вырашае пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі, патрабуюць яшчэ большага ўзмацненьня рэгулюючага ўзьдзеяньня ўсёй сыстэмы пралетарскай дзяржавы на эканамічнае разьвіцьцё краіны будуючагася сацыялізму.

Наша партыя пад выпрабаваным бальшавіцкім кіраўніцтвам тав. Сталіна, ідучы па ленінскім шляху, ажыцяўляе пабудову сацыялізму, дзякуючы пасьлядоўнаму скарыстаньню рэвалюцыйнай дыктатуры пралетарыяту.

У сваім клясічным творы «Дзяржава і рэвалюцыя» тав. Ленін пісаў: «Ці не належала камуне больш карыстацца рэвалюцыйнай уладай дзяржавы, г. зн. узброенага, арганізаванага у пануючую клясу пралетарыяту *)—(Курсыў Леніна. МК і ЛР). Іменна таму, што ў новых гістарычных абставінах пралетарыят былой царскай Расіі здолеў стварыць магутную пралетарскую дзяржаву, якая ня толькі не паўтарыла зробленых Парыскай Камунай памылак, але дала сусьветны гістарычны ўзор непадзельнага панаваньня рабочае клясы, на даным этапе завяршаецца пабудова бясклясавай грамады.

Тав. Бухарын у сваіх «Заметках эканаміста» разважаў аб тым, што «мы павінны запытаць сябе, ці не павінны мы зрабіць некалькі крокаў у бок ленінскай дзяржавы—камуны» *). Гэтая пастаноўка пытаньні зьяўляецца скажэньнем вучэньня Леніна аб пралетарскай дзяржаве. Т. Ленін, гаворачы аб саветах, як форме ўлады тыпу камуны, напамінаючы аб гераічнай барацьбе парыскіх камунараў, лічыў, што савецкая дзяржава—дзяржава дыктатуры пралетарыяту—зьяўляецца вялізарным крокам наперад у параўнаньні з той палітычнай формай, прыклад якой быў дадзены ў 1871 г.

Камуністычная партыя, скарыстоўваючы пад кіраўніцтвам свайго ЦК і яе правадыра тав. Сталіна ленінскую спадчыну, падвяла нашу краіну да такога гістарычнага перавалу, да якога ня здолела прыбясьці Парыская Камуна, бо яна, як адзначае тав. Сталін, была «дыктатура ня поўная і ня трывалая» **).

«Плян пераможнага сацыялістычнага будаўніцтва, у выніку якога на працягу другой пяцігодкі вырашаецца пабудова бясклясавага грамадзтва ў нашай краіне, патрабуе ўзмацненьня пралетарскай дзяржавы, а значыць і яе асноўных палітычных органаў—саветаў.

Зразумела, што і на гэтым этапе сацыялістычнага наступленьня рабочае клясы за канчатковае выкарчоўваньне «карэньняў капіталізму, будзе мець месца абвастрэньне клясавай барацьбы ў паасобных моманты і аса блива ў паасобных раёнах і на паасобных вучастках сацыялістычнай будоўлі, што разам з тым падкрэсьлівае ня ўкінкнёнасьць захаваньня, а ў некаторых выпадках і ўзмацненьня буржуазных уплываў на паасобныя слаі і групы працоўных, ня ўнікнёнасьць яшчэ на працягу доўгага часу праяўленьня чужых пралетарыяту клясавых уплываў у асяродзьдзе рабочых і нават у партыю». Вось чаму ні на хвіліну ня зьмяшаецца задача бязьлітаснай барацьбы з клясавымі ворагамі, якія і надалей будуць імкнуцца паслабіць моц нашай дзяржавы, пралазіць ва ўсе зьвяньні нашай сістэмы кіраўніцтва, у тым ліку і ў саветы. «Клясавы вораг,—казаў тав. Молатаў на партканфэрэнцыі,—мае сваіх агентаў і яшчэ доўга будзе мець іх на самых рознастайных вучастках сацыялістычнай будоўлі і ў самой партыі».

Такім чынам, паказаныя XVII партканфэрэнцыі патрабуюць бязьлітаснага ўскрыцьця ўсякіх апартуністычных скажэньняў вучэньня Леніна—Сталіна аб савецкай дзяржаве.

Гістарычны ліст тав. Сталіна ў рэдакцыю часопісу «Пралетарская рэвалюцыя» накладае абавязак яшчэ больш рашуча працягваць барацьбу з рознымі контррэвалюцыйнымі плынямі і рэвізіяністкімі «тэорыямі» і «тэорыйкамі», якія фактычна вядуць да аслабленьня дзяржавы дыктатуры пралетарыяту.

Дзякуючы пільнасьці партыі і яе ня прымірымых адносін да малейшай спробы сказіць генэральную лінію партыі, нядаўна была ўскрыта правая працягваньня ў друк трацкісцка-сапроўскай хлусьні аб кіруючай ролі камуністычнай партыі ў рабоце саветаў. Адзін з работнікаў інстытуту Саветаўдаўніцтва і права Комакадэміі—Шостак, як адзначае перадавы артыкул часопісу «Савецкая дзяржава і рэвалюцыя права» № 8 за 1931 г., імкнуўся «шляхам тэндэнцыйнага падбору і скажэньня фактаў, замоўчваньня станоўчай работы саветаў, ахаяць работу партыі і саветаў»...

У выніку гэткай устаноўкі Шостак прышоў да наступнага вываду: «Вывучэньне важнейшых дырэктыў ЦК і Крайкомаў паказвае, што гэтыя дырэктывы, зьвярнутыя да партыйных, прафсаюзных і кааперацыйных арганізацый, досыць часта нават ня ўспамінаюць пра саветы, а калі і спамінаюць, дык у самой агульнай форме, без паказаньня канкрэтных заданьняў».

Такім чынам, на сучасным гістарычным этапе асабліваго ўзмацненьня актыўна-узьдзейнай ролі саветаў, якое адбываецца пад непасрэдным кіраўніцтвам камуністычнай партыі, Шостак выцягвае кантрэвалюцыйны тэзіс Троцкага—Сапронава для падмацаваньня сваіх «тэарытычных» разважаньняў. Малейшая спроба рэвізаваць палажэньне аб тым, што лінія партыі і лінія саветаў—адна лінія, а таксама імкненьне давесьці, што партыя не ажыцьцяўляе кіраўніцтва саветамі, фактычна вядуць у лягер пана Троцкага, які ад сваёй тэорыі «пэрманэнтнай рэвалюцыі», немагчымасьці пабудовы сацыялізму ў адной краіне, рэвізіі клясавай прыроды нашай пралетарскай дзяржавы ўжо даўно дакаціўся да стану ідэолёга авангарду контррэвалюцыйнай буржуазіі.

Рэцыдывы розных «лявацкіх» заігбаў у рабоце паасобных зьвеньняў саветаў, што аднаўляюць у новых формах трацкісцкія ўстаноўкі, могуць мець месца ў нашай далейшай барацьбе за замацаваньне сацыялізму. Партыя сваёй пастановай на XVII канфэрэнцыі падкрэсьліла неабходнасьць разгортваньня барацьбы з правым ухілам, які застаецца галоўнай небясьпекай на даным этапе. Але гэта зусім не азначае, што партыя спыняе альбо паслабляе барацьбу з праявамі «лявізны».

* * *

У сваім канспэкце брашуры «Аб дыктатуры пралетарыяту» надрукаваным у III ленінскім зборніку, тав. Ленін пакінуў нам некалькі гэніяльных указаньняў, якія і сёньня поўнасьцю могуць быць накіраваны супроць розных правых «лявацкіх» тэарэтыкаў.

«Асноўная крыніца,—пісаў Ленін,—неразуменьня дыктатуры пралетарыяту «сацыялістамі»—гэта недавядзень не ідэі канца ідэі клясавай барацьбы.

Дыктатура пралетарыяту ёсьць працяг клясавай барацьбы пралетарыяту ў новых формах. У гэтым гвоздь, гэтага не разумеюць *).

Тав. Ленін называў нашу пралетарскую дзяржаву паўдзяржавай, падкрэсьліўшы яе ня зусім дзяржаўны характар.—Гэтае палажэньне тав. Леніна абазначае, што праз дыктатуру пралетарыяту ажыцьцяўляецца вялізарнейшая справа зьнішчэньня ўсіх клясаў сучаснага грамадзтва, а такім чынам і рабочай клясы і працоўнага сялянства; праз дзяржаву пралетарыяту ажыцьцяўляецца ператварэньне рабочых і сялян у работнікаў камуністычнага грамадзтва.

Шлях канчатковага вырашэньня гэтага гістарычнага працэсу вызначан XVII партканфэрэнцыяй. Гэты працэс — працэс ператварэньня старых грамадзкіх суадносін у новыя, праходзячы на ўмовах абвостранай клясавай барацьбы, аб'ектыўна зьнішчае і тыя ўмовы, дзякуючы якім існуе дзяржава. «Чым дэмакратычней дзяржава, — пісаў Ленін, — якая складаецца з узброеных рабочых і зьяўляецца «ўжо не дзяржавай ва ўласным сэнсе слова», тым хутчэй пачынае адмерць усякая дзяржава» **) Курсыў Леніна. Аўтары).

Але з гэтых агульна вядомых ленінскіх выказваньняў сёй-той рабіў вывад, што ўжо на даным этапе можна паставіць пытаньне аб адмаўленьні базавых зьвеньняў нашай дзяржаўнай сыстэмы, паставіць крыж над задачамі ўзмацненьня кіруючай ролі саветаў. Яны запамяталі аб другім выказваньні Леніна: «Сацыялізм ёсьць зьнішчэньне клясаў, — пісаў ён, — але ад разу зьнішчыць клясы нельга... Клясы засталіся і застануцца на працягу эпохі дыктатуры пралетарыяту. Дыктатура будзе непатрэбна, калі зьнікнуць клясы. Яны ня зьнікнуць без дыктатуры пралетарыяту **).

Рост і ўзмацненьне нашай савецкай дэмакратыі, уцягненьне мільёнаў працоўных у справу кіраўніцтва дзяржавай абазначае ўзмацненьне савецкай сыстэмы; але гэтае ўзмацненьне адна часова абазначае і дыялектычнае ператварэньне нашай дзяржавы.

Тав. Кагановіч у адным з сваіх дакладаў сказаў: «Пралетарская дыктатура не бясконцая. Адміраньне дзяржавы ёсьць працяжны працэс. У нашай дзяржаве ўжо закладзены элемэнты гэтага адміраньня. Але калі зна ходзяцца людзі, якія ў прадбачаньні адміраньня дзяржавы прапануюць ўжо зараз паслабіць сілу пралетарскай дыктатуры, паслабіць яе напор на варожыя пралетарыяту клясы і групы, дык мы на гэта адкажам: не чакайце на бліжэйшы пэрыяд якога-б то ні было зьмякчэньня пралетарскай дыктатуры. Наадварот, на бліжэйшы пэрыяд лёзунг партыі: не зьмякчэньне, не размагнічваньне, а ўсямернае ўмацаваньне пралетарскай дыктатуры, умацаваньне яе за ўсіх галінах *). (Падкрэсьлена аўтарамі).

* * *

Разгорнутае сацыялістычнае наступленьне, якое праводзіцца пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі, патрабуе ўсямернага ўзмацненьня асноўных органаў дыктатуры пралетарыяту — саветаў.

Партыя за апошнія гады вынесла шэраг важнейшых пастаноў, у якіх вызначан шлях разьвіцьця ўсёй работы саветаў на даным этапе і даны канкрэтныя і чоткія дырэктывы аб не рабудове ўсіх галін работы саветаў.

Дастаткова спаслацца на пастановы сьнежаньскага пленуму ЦК УсеКП(б) 1930 г. аб выбарах саветаў, чэрвеньскага пленуму аб разьвіцьці гарадзкой гаспадаркі, каб стала ясным, што ня можа быць аніякай гутаркі пра адсутнасьць належнай увагі з боку партыі да работы саветаў.

Цэнтральны Камітэт КП(б)Б у разьвіцьцё вышэйадзначаных пастаноў партыі неаднаркраць даваў канкрэтныя дырэктывы аб перабудове і ўзмацненьні работы саветаў ды іх органаў. Так, у свой час была вынесена пастанова бюро ЦК КП(б)Б аб працы Менскага гарадзкога савету, якая фактычна давала напрамак работы ня толькі гарсавету сталіцы БССР, але зьяўлялася праграмай дзеяньня для саветаў усіх гарадоў БССР.

Такое-ж актуальна палітычнае значэньне набывае ліст ЦК, ЦКК КП(б)Б і ЦСПСБ «Аб чарговых задачах па прыцягненьні рабочых мас да ўдзелу ў рабоце савецкага апарату».

Гэты палітычны дакумент зьмяшчае надзвычай канкрэтныя ўказаньні аб формах і мэтадах перабудовы мас савай работы саветаў. Зьместам усіх паказаных пастаноў і дырэктыў партыі зьяўляецца патрабаваньне паставіць работу саветаў па-новаму. Стаць сапраўднымі пачынальнікамі арганізацыі волі мільённых мас у справе выкананьня задачы, пабудовы бясклясавага грамадзтва, выразна і рашуча праламляць чарговыя баявыя задачы гаспадарчага і культурнага будаўніцтва — вось галоўны напрамак работы саветаў на даным этапе. Як і раней, вядучая роля ў ажыцьцяўленьні гэтых гістарычных задач застаецца за саветамі гарадоў, якія аб'ядноўваюць рабочых нашай сацыялістычнай прамысловасьці.

На ўсіх этапах барацьбы за ўмацаваньне ўлады пралетарыяту, рабочая кляса, арганізаваная ў саветы, зьяўлялася рашаючай сілай, якая накіроўвала ся партыяй для ажыцьцяўленьня справы сацыялістычнай рэвалюцыі. У час Кастрычніцкай рэвалюцыі саветы сталі сапраўднай цытадэляю пралетарыяту. Саветы зьяўляліся цэнтрамі, якія мабілізавалі актыўнасьць і гатоўнасьць шырокіх рабоча - сялянскіх мас на барацьбу за арганізацыю пэўстаньня і заваёву ўлады.

«У першы пэрыяд рэвалюцыі, — піша т. Кагановіч,—калі быў неабходны заводчыкаў, у вёсцы—на памешчыкаў на іх урад, саветы зьяліся арганізатарамі нацыску мас. У другі пэрыяд, калі патрэбна было разьбіць узброенага ворага, саветы зьявіліся мабілізуючымі цэнтрамі і арганізатарамі перамогі. У трэці пэрыяд разгортваньня сацыялістычнага будаўніцтва, саветы павінны былі зьявіцца арганізуючымі цэнтрамі палітычнай актыўнасьці і самадзейнасьці мільёнаў рабоча - сялянскіх мас, падрыхтоўкі новых кадраў будаўнікоў сацыялістычнай гаспадаркі *).

На сучасным этапе, калі СССР уступіў у пэрыяд сацыялізму і пытаньне: «хто - каго» вырашана ў нашай краіне на карысьць сацыялізму, перад гаворнымі саветамі паўстае задача «пановаму работаць, па-новаму кіраваць», як вызначана ў гістарычнай прамове тав. Сталіна на нарадзе гаспадарнікаў.

* * *

У адпаведнасьці з вызначанымі за-

*) Ленін «Дзяржава і рэвалюцыя», Гіз 1930 г. стар. 95.

*) Бухарын. «Заметкі, эканаміста», Гіз, 1928 г., стар. 54.

**) Сталін. «Пытаньні ленінізму». 4-е Выд. 1931 г., стар. 273.

*) III Ленскі зборнік, стар. 500.

**) Ленін, т. XIV ч. 2, выд. I, с. 380.

* Ленін, т. XVI, выд. I, с. 353.

*) «Сав. Дзярж. і рэвал. права» № 1—1930 г., с. 43.

*) Кагановіч «Партыя і Саветы 1928 г. с. 66.

Линейная калибровочная мишень LRT-BE4-V2

НА БАЛЬШАВІЦКІ ШТУРМ НЯПІСЬМЕННАСЬЦІ

Пастанова Прэзыдыуму Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР

па дакладзе аб ліквідацыі няпісьменнасьці ў БССР

1. Барацьба супроць няпісьменнасьці, за суцэльную пісьменнасьць БССР зьяўляецца важнейшай суставой часткай барацьбы за сацыялізм. У. І. Ленін неаднаразова падкрэсьліваў, што «ў краіне няпісьменнай пабудаваць камуністычнага грамадзтва нельга».

Прэзыдыум ЦВК БССР адзначае, што рабочая клясa пад кіраўніцтвам камуністычнае партыі пры актыўным удзеле шырокіх працоўных мас дабілася вялікарных посьпехаў у барацьбе са спадчынай мінулага—з няпісьменнасьцю (ліквідавана няпісьменнасьць сярод звыш 800.000 ч., узьнята агульная пісьменнасьць з 31,8—1920 г. да звыш 80%—31 г., сотні прадпрыемстваў, саўгасоў, калгасаў і дзесяткі сельсаветаў пераведены ў суцэльна пісьменныя), у выніку чаго отворены рашаючыя прадпасылкі для ажыцьцяўленьня пастаўленай партыяй і ўрадам палітычнай задачы—ператварэньня БССР да 1-га мая 1932 году ў краіну суцэльнай пісьменнасьці.

Аднак Прэзыдыум ЦВК прызнае, што сучаснае становішча работы па ліквідацыі няпісьменнасьці па радзе раёнаў зьяўляецца зусім неадпавядаючым: Барысаўскі—ахоплена 47 проц., паведзвае 70 проц., Дрысенскі—52 пр., Мазырскі—60 проц., Быхаўскі—69 пр., Смалявіцкі, Капыльскі, Петрыкаўскі, (па БССР ахоплена 54 проц.).

Усеагульная ліквідацыя малапісьменнасьці ў гарадох і спэцыяльных раёнах знаходзіцца пад пагрозай зрыву (па БССР ахоплена 54 проц.).

Частка нізавых арганізацый: сельсаветы, яячейкі фабзаўкомы, асабліва прадпрыемстваў, калгасаў, недастаткова ўключыліся ў барацьбу за суцэльную пісьменнасьць і слаба кіруюць тэтай работай. На многох вёсках антырэлігійная ўстановка чарасьсядзкіх кулакоў, нарушэньне ўмоваць работу па ліквідацыі няпісьменнасьці з гаспадарчапалітычнымі кампаніямі, якія праводзіцца.

Прэзыдыум ЦВК БССР пастанаўляе:

1. Усім РВК, Гарсаветам, мястачковым і сельскім саветам, НКА і яго органам замацаваць дасягнутыя посьпехі, разгарнуць масавую работу, забясьпечыць замацаваньне ўсіх ахопленых вучобай, дабіцца 100 проц. неадпаўваньня заняткаў, разгарнуць шырокую работу па арганізацыі ліквпунктаў у саўгасах, калгасах, асабліва на новабудоўлях, торфаразпрацоўках і лесаразпрацоўках. Забясьпечыць разгортваньне работы па ліквідацыі няпісьменнасьці сярод нацменшасьцяй на іх роднай мове.

РВК на працягу дэкады заслухаць даклады АНА, пасобных адстаючых сельсаветаў, прадпрыемстваў, саўгасаў і калгасаў. Ва ўсіх сельсаветах, саўгасах і калгасах вылучыць членаў, сельсаветаў і праўленьняў калгасаў, адказных за ліквідацыю няпісьменнасьці.

2. РВК, Гарсаветам неадкладна ўкзываць нізавыя арганізацыі, сельсаветы, калгасы, фабзаўмясцкомы ў справе ліквідацыі няпісьменнасьці, забясьпечыўшы з іх боку шырокае разгортваньне работы і арганізацыю апэрацыйнага кіраўніцтва. Адначасова прыняць адпаведныя захады па актывізацыі нізавых арганізацый т-ва «ПН» і шырокага разгортваньня работы па ліквідацыі няпісьменнасьці.

3. Прапанаваць НКА і яго органам на месцох узьняць барацьбу за якасьць работы, за дакладную праграму праграм і ўсваеньня дапаведнага мінімуму агульна-адукацыйных і політэхнічных ведаў, забясьпечыўшы ўвядзеньне па ўсіх ліквпунктах палітэтэхн.-граматы гадзін.

4. Паказаць Барысаўскаму, Мазырскаму, Смалявіцкаму, Дрысенскаму, Капыльскаму, Петрыкаўскаму, Быхаўскаму РВК на зусім неадзавальняючае правядзеньне работы па ператварэньні раёнаў у суцэльна пісьменныя. Прапанаваць паказаным РВК неадкладна забясьпечыць разгортваньне работы поўны ахоп няпісьменных ліквпунктамі, дабіцца поўнага наведваньня ліквпунктаў і школ малапісьменных.

5. Адзначыць, што Белкаапсаюз і Белкалгасцэнтр з іх нізавыя арганізацыі ня ўключыліся ў справу ліквідацыі няпісьменнасьці. Белкаапсаюз не забясьпечыў своячасовага і бесперабойнага забясьпечэньня падручнікамі, асабліва сшыткамі, алоўкамі і газай. Белкалгасцэнтр не мабілізаваў калгасную сьвітэму на барацьбу з няпісьменнасьцю сярод калгасьнікаў. Прапанаваць Белкаапсаюзу неадкладна забясьпечыць ліквпункты сшыткамі, алоўкамі, вылучыць і забяспечыць патрэбную колькасьць газы для ліквпунктаў і школ малапісьменных.

6. НК Асьветы, РВК, Гарсаветам, мястачковым і сельскім саветам ператварыць барацьбу за суцэльную пісьменнасьць у штодзенную масавую работу, сыстэматычна перамагаючы зьнізу пасобных прадпрыемстваў, калгасы, саўгасы, МТС, сельсаветы, гарады ў суцэльна-пісьменныя, арганізуючы ўзаемную самаправерку і дапамогу. Першага мая арганізаваць урачыстыя выпускі ліквпунктаў.

7. Даручыць НК Асьветы, РВК і Гарсаветам пры ўдзеле грамадзкіх арганізацый выявіць і прыцягнуць абгаварыць лепшых работнікаў, культармейцаў, ударнікаў барацьбы за суцэльную пісьменнасьць для грамадзкіх і дзяржаўных узнагарод, а таксама для прэміраваньня іх.

8. Улічваючы, што барацьба за суцэльную пісьменнасьць за выхаваньне шырокіх працоўных мас разгортваецца ва ўмовах абвостранай клясавай барацьбы, пры супрацьдзеньні клясавага ворага, супроць мерапрыемстваў па ліквідацыі няпісьменнасьці (агітацыя кулака, падбухторваньне адсталай часткі, п'яніка, вечарынкі, накіраваныя на зрыў работы ліквпунктаў, нагрэсы ліквінтарэяў і г. д.), саветы, прафсаюзныя грамадзкія арганізацыі, органы нарасьцыеты і культармейцы павінны правесьці асабліваю клясавую пільнасьць, выдучы рашучую барацьбу супроць выдзявак клясавага ворага.

9. Даручыць Наркамасьветы на працягу арасавіка м-ца праверыць работу адстаючых раёнаў і асобных арганізацый.

Даручыць раённым выканаўчым камітэтам прыняць меры да мабілізацыі ўсёй пралетарскай грамадзкасьці на бальшавіцкі штурм супроць няпісьменнасьці—вогнага зьлейшага ворага сацыялізму, паставіўшы створаной задачай для кожнага прадпрыемства, калгасу, саўгасу, сельсавету школы да тэрміновага рапартаваць партыі і ўраду аб пасьпяховым скончэньні работы.

10. Прэзыдыум ЦВК зажыкае усе ўстановы, арганізацыі і ўсю пралетарскую грамадзкасьць БССР прыняць ак тыўны ўдзел у штурме супроць няпісьменнасьці, памятуючы паказаньні У. І. Леніна, што «у краіне няпісьменнай пабудаваць камуністычнага грамадзтва нельга».

11. Рэдакцыі газэты «Савецкая Беларусь», усім цэнтральным і раённым газетам забясьпечыць шырокае асьвятленьне работы па ператварэньні БССР у краіну суцэльнай пісьменнасьці.

Старшыня Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР
А. Чарвякоў.

Сакратар Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР
М. Гілякевіч.

3 красавіка 1932 г.

Аб правядзеньні ўсесаюзнага конкурсу на лепшага сьвінара

Пастанова Народнага Камісарыяту Земляробства БССР

У адпаведнасьці з пастановай Калегіі НКЗ СССР ад 17-III-32 г. аб правядзеньні з 25-III па 1-VI-32 г. усесаюзнага конкурсу спаборніцтва на лепшага сьвінара НКЗ БССР **пастанаўляе:**

1. Уключыцца ва Ўсесаюзны конкурс і правесьці ў БССР конкурс спаборніцтва на лепшага сьвінара ў рэспубліцы.

2. Стварыць рэспубліканскі штаб конкурсу спаборніцтва ў складзе тав. **Рачыцкага**, (старшыня) **Сокалава, Аўчынікава, Красоўскага, Падвойскага** і прадстаўнікоў ЦК КСМБ, газэт «Звязда», «Савецкая Беларусь», «Калгасьнік Беларусі», «Чырвоная Зьмена» і «Сельгасрабочы».

3. Даручыць усім РВК безадкладна арганізаваць у раёнах, саўгасах і калгасах штабы садзейнасьці правядзеньня Ўсесаюзнага конкурсу.

4. Абавязаць Сьвінаводтрэст, Калгасцэнтр, Сьвінаводкалгассаюз стварыць у цэнтральным і раённым апаратах камісіі садзейнасьці правядзеньня конкурсу спаборніцтва.

5. Абавязаць раённыя штабы садзейнасьці правядзеньню конкурса, Сьвінаводтрэст, Калгасцэнтр, Сьвінаводкалгассаюз з 10-га красавіка г.г. правесьці конкурсы—спаборніцтва на лепшага сьвінара ў саўгасах, калгасах (СТФ) і раёнах, безадкладна разгарнуўшы шырокую масавую работу па абгаварэньні на вытворчых нарадах у калгасах, саўгасах і брыгадах сьвінароў, ці агульнымі сходамі сьвінароў саўгасу ці калгасьнікамі.

6. У конкурсе удзельнічаюць ўсе старшыя сьвінары саўгасаў, калгасных сьвінафэрм і калгасаў. Падаючыя удзельнічаць ў конкурсе сьвінары падаюць заявы ў штаб садзейнасьці правядзеньню конкурсу, саўгасу, калгасу ці раёну.

7. Раённыя штабы і штабы саўгасаў і калгасаў:

а) уцягваюць ў конкурс старшых сьвінароў калгасных фэрм саўгасаў і калгасаў.

б) Арганізоўваюць абмеркаваньне паказьнікаў высунутых конкурсам на шырокіх вытворчых нарадах калгасьнікаў і рабочых саўгасаў.

в) Шырока разгортваюць спаборніцтва сьвінароў унутры гаспадарак, паміж раёнамі і арганізоўваюць грамадзкія запісы сьвінароў на конкурс.

г) Арганізуюць дапамогу і кансультацыю сьвінарам, якія ўдзельнічаюць ў конкурсе і асьвятляюць у друку ход конкурсу і работу асобных сьвінароў.

д) Вывучаюць дасягненьні лепшых сьвінароў з мэтай перанясеньня іх вопыту ў працу усіх саўгасаў і калгасаў.

8. Абавязаць раённыя штабы з 20 па 25 мая правесьці раённыя зьлёты сьвінароў для абмеркаваньня дасягненьняў і прысуджэньня прэміі лепшым сьвінарам, узяўшы іх на асобны вучот на прадметы вылучэньня на больш адказную работу.

Матар'ялы з паказьнікамі работы сьвінароў, якія прадстаўляюцца на конкурс, павінны быць абмеркаваны і прыняты агульнымі сходамі брыгад сьвінароў, ці агульнымі сходамі сьвінароў саўгасу ці калгасьнікамі.

9. У дадатак да прэміяльнага фонду і прэмій, устаноўленых НКЗ СССР, вылучыць для прэм'яваньня па конкурсу спаборніцтву старшых сьвінароў у рэспубліцы 15.000 руб., устанавіўшы наступныя прэміі.

а) 10 прэмій па 500 руб.
14 прэмій па 250 руб.
20 прэмій па 200 руб.
і 20 прэмій па 150 руб.

б) Вызначыць спэцыяльныя прэміі дырэктарам сьвінасаўгасаў, загадчыкам сьвінафэрм і спэцыялістам пры ўмове выкананьня прамфінпляну, тых гаспадарак, з якіх будуць прэм'іраваны старшыя сьвінары першымі прэміямі, у разьмерах месячнага заработку.

в) Рэдакцыям раённых і цэнтральных газэт, за лепшае разгортваньне масавых мерапрыемстваў вакол конкурсу і за лепшы паказ работы сьвінарніка і работы сьвінара ня старонках газэт, устанавіць прэмію ў разьмеры 1000 руб., вызначыўшы 5 прэмій па 200 руб. для шматтыражак і насьценных газэт.

г) Вызначыць адну прэмію аўтару за лепшую брашуру аб сьвінары ў 300 руб. (памяць аўтарскага гонарару).

7. Устанавіць наступныя паказьнікі на лепшага сьвінара:

а) здача сьвіней ў адкормленым стане да 8 мес. узросту ўстаноўленых кандыцый, г. зн. ня ніжэй 80 кгр. пры захаваньні (сярэднім) ня менш 5 падсьвінкаў на апарос.

б) Затрата корму на 1 кгр. прыросту не павінна перавышаць 5 кгр. кармавых адзінак.

в) Захаваньне да часу адёму жывых парасят ня менш 6 штук на апарос, з давядзеньнем да 2-х мес. узросту жывой вагі ня ніжэй 10 кгр. на кожнае парася.

г) Забясьпечыць сутачную прыважку парасят, атнятых ад матак за пэрыяд конкурсу ня ніжэй 400 гр. ў суткі да 8 мес. узросту.

д) У час з 10-га красавіка (пачатак конкурсу) і да 15 чэрвеня (апошнія дні пакрыцьця для масавых асеньніх апаросаў) на фэрме не павінна быць не пакрытых матак.

8. Даручыць сэктару жывёлагадоўлі і тэхпропу праз рэдакцыі цэнтральных газэт разгарнуць ў друку шырокую кампанію вакол конкурсу—спаборніцтва і ўзгадніць паміж газэтамі разьмеркаваньне раёнаў для лепшага абслугоўваньня ў іх конкурсу—спаборніцтва.

9. Сэктару Жывёлагадоўлі і тэхпропу тэрмінова арганізаваць пасылку на месцы брыгад калгаснай сыстэмы рэдакцый цэнтральных газэт з мэтай хутчэйшай арганізацыі на месцох шырокай грамадзкай кампаніі вакол правядзеньня конкурсу- спаборніцтва.

10. Устанавіць дэкадную справаздачнасьць аб ходзе конкурсу.

Нарком Земляробства БССР.
РАЧЫЦКІ.

Бальшавіцкая вясна патрабуе аб транспарту чоткай работы

Трэняя бальшавіцкая вясна надыходзіць. Праз некалькі дзён саўгасныя і калгасныя брыгады выйдуць на поле змагацца за добры ўраджай, за мільёны тон хлеба для краіны.

Праз некалькі дзён на полі павінны выйсьці падрыхтаваныя машыны, павінна быць вывезена ўгнаеньне.

Але ня ўсюды калгасамі атрыманы машыны, угнаеньне і іншыя сяўбовыя матар'ялы. Ня ўсюды яны падрыхтаваны да баявога выхаду ў поле.

Частка машын яшчэ стаіць на заводзкіх дварох у чаканьні вагонаў, якія-б павезьлі іх на палі. Тысячы тон угнаеньня і іншых сяўбовых матар'ялаў парацца ў вагонах, якія ператрымліваюцца на станцыях, прастойваюць там суткі і не атрымліваюць руху.

Ад транспарту зараз патрабуецца асаблівая гібкасьць, наваротлівасьць і ўменьне скарыстаць вагоны і паравозны паркі. Абсалютна кожная адзінка і зьвяно транспартнай гаспадаркі павінны быць выключна гібкімі, бо на ўсіх ляжыць абавязак:

— Сяўбовым грузам даваць пуцёўкі без чаргі!

Без чаргі грузіць і перавозіць

— Не дапусьціць ніводнай ператрымкі вагона з сяўбовымі!

Але факты, якія падаюцца ў матар'яле, зьмешчаным ніжэй сьведчаць аб тым, што некаторыя вузлы яўна не здавальняюць тыя запатрабаваньні, якія прад'яўлены ім патрэбамі бальшавіцкай вясны.

Факты ператрымак сяўбовых грузаў пад патрузкай і выгрузкай (Жлобін) сьведчаць аб тым, што службы эксплёатацыі яшчэ ня выконваюць загаду тав. Андрэева аб павялічэньні карыснай работы вагоннага парку і пастановы ЦК КП(б)Б аб бесчарговай ракідцы сяўбовых матар'ялаў. Службы эксплёатацыі не пераключыліся на такую пастаноўку работы, якая-б пры максымальным павялічэньні работы вагонаў стварыла-б магчымасьць без затрымкі грузіць вагоны і без затрымкі іх разгружаць.

Службы руху ператрымліваюць вагоны на станцыях звыш дазволенага часу. Вагоны замаражваюцца на віне дыспэтчараў, якія часамі ня ведаюць аб прыбыўшых вагонах і ня могуць іх зараз-жа адпраўляць.

Побач з гэтымі недахопамі ў рабоце чыгункі трэба паказаць і на некаторую віну ў дрэннай перакідцы веснавых грузаў з боку кліентуры, якая грузы адпраўляе і прымае.

Заводы (Гомсельмаш) не заўсёды за бясьпечваюць загрузку машынамі тых вагонаў, якія ім чыгункай падаюцца. Асобныя арганізацыі («Саюзхлеб») робяць тое-ж самае і, не забясьпечыўшы загрузку паданай колькасьці вагонаў, зрываюць перавозку.

Калгасы, якія атрымліваюць машыны і ўгнаеньне, ператрымліваюць грузы на станцыях. Асабліва ўгнаеньне (і асабліва на ст. Жлобін) тыднямі пралежвае на дарозе, бо яго не забіраюць.

Бясспрэчна, што ёсьць прыклады і добрай работы. Але гэтых прыкладаў зусім мала, іх трэба настойліва множыць для таго, каб чыгуначны транспарт быў рухавіком сяўбы.

Прарывы, якія вышэй пералічваліся, можна тлумачыць толькі адным. У рабоце па перавозцы веснавых грузаў няма штодзеннага ўмяшаньня партыйных арганізацый і кіраўніцтваў раёнаў, якія часта нічога ня ведаюць аб падобных і ганебных прарывах. Яшчэ ня ўсюды ёсьць штодзеннае, апэрацыйнае ўмяшаньне ў перавозку веснавых грузаў з боку партыйных калектываў, службаў эксплёатацыі і руху і ня ўсюды цэнтр работы перанесены ў нізавое зьвяно—партгрупу і профгрупу. Гэта аб чыгуначным транспарце.

Яшчэ больш ганебныя факты маюць месца ў адносінах водзнага транспарту. Ён яшчэ як след не скарыстоўваецца для перавозак веснавых грузаў, шмат хто з кліентуры не заключыў з рачным флётам дагавораў на перавозкі.

Усе гэтыя факты павінны пераканаць усе арганізацыі па чыгунцы, на водным транспарце і ўсю кліентуру, што ў справе перавозкі веснавых грузаў ёсьць шмат прарываў. Гэтыя прарывы трэба неадкладна ліквідаваць праз чоткую работу, праз арганізацыю бесьперабойнай работы кожнага зьвяна.

Не затрымліваць машыны

За перавозку адказвае і вузел, і завод

Перакідка сельска-гаспадарчых машын мае зараз асаблівае значэньне. Гомсельмаш, які гэтыя машыны вырабляе, забясьпечвае калгасы усёй Беларусі. На чыгунцы ляжыць абавязак бесьперабойна падаваць да заводу вагоны, якія забясьпечылі-б перавозку і падаваць тую колькасьць, якая вызначана паводле плану.

З боку Гомельскага чыгуначнага вузла праяўлена нераспаравачасьць і няўменьне арганізаваць прысылку патрэбнай колькасьці вагонаў. Праўда, раней вузел дастаўляў гэтую колькасьць, але за апошні час патрэбнай колькасьці амаль-што ніколі ня прысылае.

У гэтым, бясспрэчна, вінаваты эксплёатацыйны аддзел вузла, які недапаўняў перавозкі сельскагаспадарчых машын і які таму не правяў уменьня штодзенна даваць для заводу 22 вагоны.

Аднак, нельга абвінавачваць толькі аддзел эксплёатацыйны аддзел. Віна эксплёатацыйнага аддзелу бясспрэчная.

Але вінаваты і завод. Ён не пасьпяваў і ня мог загрузіць тыя 22 вагоны, якія часта чыгункай падаваліся. Замест гэтай колькасьці вагонаў, Гомсельмаш грузіў 7-6, а то часамі нават і 4 вагоны. Падаваныя для заводу вагоны прастойвалі без загрузкі і таму 8-гадзінная карысная работа вагонаў у сутки зрывалася.

Зараз надыходзіць пэрыяд асабліва ўзмоцненай перакідкі машын, за які ў калгасы трэба адправіць усе вырабленыя машыны.

Гэта адказная задача ўскладае адпаведныя абавязкі як на Гомсельмаш, так і на Гомельскі чыгуначны вузел.

С. Л.

ПЕРАПРАСТОЙ НА ДЗЕСЯТКІ ГАДЗІН

Узор таго, як ня трэба адносіцца да перавозкі сяўбовых матар'ялаў і як іх ня трэба перавозіць паказвае Калінкавіцкі вузел.

Усе транзітныя вагоны, якія прыбываюць у Калінкавічы, мусуць прастойваць там на станцыі ня больш 4 гадзін. 4 гадзіны—гэта максымальны час прастою вагона, у які павінны і мусуць укладвацца работнікі Калінкавіцкай станцыі і рабочыя-рухавікі.

Аднак, вагоны, якія прыбываюць у Калінкавічы, робяць значна большы перапрастой, які ў некаторых выпадках дахоўзіць нават да 24 гадзін. Пад лік за 10 апошніх дзён паказаў, што ў Калінкавічах 177 вагонаў зрабілі замарожаны ў Калінкавічах і што рачыць, што больш сотні вагонаў былі замарожаны ў Калінкавічах і што работнікі руху ня здолелі іх адправіць.

Многія спрабавалі давесьці, што вагоны перапрастойваюць таму, што прыбываюць яны ў Калінкавічы пасьля адпраўленьня якога-небудзь тавараднага цягніка. Але гэта яўнае хавэнь не сапраўдных прычын. Тыя вагоны, якія прастойваюць у Калінкавічах па 24 гадзіны, магчы быць адпраўлены дзесяткі разоў, бо за 24 гадзіны з Калінкавіч адпраўляецца некалькі цягнікоў.

Дрэнная арганізацыя складаньня цягнікоў—вось адзіная прычына, якую ня ўдасца захаваць калінкавіцкім работнікам і супроць якой яны пасілны варас-жа распачаць барацьбу.

Л.

СЯЎБОВЫЯ ЗАМАРОЖВАЮЦЦА

Ня гледзячы на многія распараджаньні аб бесчарговай выгрузцы насеных грузаў, усё-ж некаторыя станцыі ніякіх мер да гэтага ня ўжываюць. Гэта можа пацьвердзіць станцыя Полацак, да якой, як відаць, не датычацца гэтыя распараджаньні і якая ня хоча іх выконваць.

Вагон № 484079 з насеньнем бурачоў, які прыйшоў на станцыю Полацак яшчэ 16 сакавіка, быў паданы пад разгрузку толькі 22 сакавіка. Ва тон № 632528 вялікай хуткасьці з насеўным матар'ялам прыйшоў 26 сакавіка, а быў паданы пад разгрузку толькі 30 сакавіка.

Шмат вагонаў прастойваюць па віне клієнтуры, але гэтаму прастою не вядомна ніякага ўліку. Адвойчы 5 вагонаў з пасеўнай кукурузай былі да 15 гадзін паданы на ветку для выгрузкі. На выгрузку паслалі рабочых, але аказалася, што там няма мяшкоў. Вагоны засталіся ня выгружанымі, а грузчыкі былі без работы.

Такія агідныя факты неспарадчасці ніяк нельга цярпець. Станцыі Полацак абавязана дапамагчы кіраўніцтва Віцебскага чыгуначнага раёну, якое павінна паслаць туды сваіх прадстаўнікоў і дамагчыся ліквідацыі па мянёных прарываў.

«З. С. Т.».

Спадчына ворага знішчыта Бел. арэала. (Жлобінскае лаво).

Дарога адкрылася

Даць рачному флёту сяўбовыя грузы

Плян перавозак Гомельскага рачнога флёту ў красавіку і ў маі складае каля 50.000 тон грузаў малой хуткасьці. Але да гэтага часу заключаны дагаворы на перавозку 35.586 тон грузаў. Гэтымі днямі будуць аформлены дагаворы на перавозку яшчэ 1.800 тон. Заключаны дагаворы з арганізацыямі Саюзпяклопарцаляны, УНР-10 сплаўной канторы Лесбелу, Белкаапрамсаюзам, Белкаагароднінай, Саюзхлебам і іншымі.

Была цьвёрдая дырэктыва Гомельскай РСІ аб заключэньні да 15 сакавіка дагавораў з Гомельскай прыстанню такіх арганізацый, як ЦРК, транспартнае спажывецкае таварыства і ўсе закрытыя рабочыя каапэратывы. Аднак, ніводная з гэтых арганізацый ня выканала паказаньня да таго часу, які ёй быў прад'яўлены.

Побач з гэтым ёсьць незадкладнасьць не некаторых дагавораў на перавозку веснавых грузаў. З рачным флётам заключыў дагавор на перавозкі Саюзхлеб. Да яго трэба прад'явіць асаблівыя патрабаваньні.

Саюзхлеб фактычна зрывае перавозку сваіх веснавых матар'ялаў на Гомельскім чыгуначным вузле. Вагоны, якія падаюцца для выгрузкі на станцыі раёну сыстэматычна не загружаюцца Саюзхлебам. На яго віне вагоны прастойваюць ненагружанымі і не скарыстоўваюцца.

Трэба думаць, што такую-ж нешава ротлівасьць можа дапусьціць Саюзхлеб і ў часе перавозкі грузаў рачным флётам. Таму Саюзхлеб павінен зараз-жа прыняць захады і забясьпечыць перавозку тых грузаў, якія ім па дагаворы вызначаны.

Адначасова веснавыя перавозкі і асабліва сяўбовыя вымагаюць і ад прыстаняй больш чоткай работы, неадкладнага і шырокага разгортваньня культурна-масавай работы сярод рабочых-водніка ў, рэалізацыі 6 паказаньняў тав. Сталіна ва ўсёй сваёй далейшай рабоце. (Белта)

дачамі патрабуецца грунтоўная перапрацоўка дзейнага палажэньня пра гарадзкія саветы БССР. У гэтым палажэньні, зацьвярджаным ЦВК БССР 22 сьнежня 1928 г. і існуючым без карэнных зьмен да гэтага часу, не знайшлі адлюстраваньня тыя новыя задачы і запатрабаваньні, якія высоўваліся партыяй і ўрадам у апошні пэрыяд.

Цэнтральным Выканаўчым Камітэтам і Саветам Народных Камісараў БССР у апошнія гады выданы рад пастаноў, якія датычацца розных галін работы саветаў, у якіх выразна адбіты ўсе дырэктывы нашай партыі па пытаньнях савецкага будаўніцтва.

Укладальнікі новага палажэньня пра гарадзкія саветы БССР лічылі неабходным, каб праект, які выносіцца на шырокае абгаварэньне савецкай грамадзкасьці, цалкам быў пабудаваны на аснове апошніх гістарычных рашэньняў партыі і грунтаваўся на заканадаўчых матар'ялах і дырэктывах ураду БССР.

Палітычны напрамак работы саветаў будзе ператварацца ў жыцьцё на аснове шасьці гістарычных умоў тав. Сталіна. Геніяльны зьмест гэтых умоў заключаецца ў тым, што яны вызначаюць характар работы саветаў на ўвесь этап завяршэньня пабудовы бясклясавага грамадзтва. Укладальнікі праекту лічылі сваёй першачарговай задачай пранізаць яго зьместпаказаньнямі XVII партканфэрэнцыі, раённыя якой грунтуюцца на ленінскай спадчыне.

Палажэньне з рэвалюцыі канфэрэнцыі аб «... ператварэньні ўсяго працоўнага насельніцтва краіны ў сьвядомых і актыўных будаўнікоў бясклясавага сацыялістычнага грамадзтва» будзе ажыцьцяўляцца праз саветы на аснове ленінскай думкі аб тым, што мы ад «кіраваньня для працоўных» ідзем да «кіраваньня праз працоўных». Гэты палітычны напрамак работы гарсаветаў у праекце выражан наступным чынам: «Гарсавет, зьяўляючыся органам пралетарскай дыктатуры: «ажыцьцяўляе пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі дзяржаўную ўладу рабочае клясы на падставе пагалоўнага прыцягненьня ўсяго працоўнага насельніцтва да кіраўніцтва дзяржаваю для хутчэйшай індустрыялізацыі краіны, сацыялістычнай перабудовы сельскай гаспадаркі, разьвіцьця сацыялістычнай культуры — у мэтах канчатковай ліквідацыі клясаў і пабудо

Пры распрацоўцы новага праекту палажэньня пра гарадзкія саветы БССР у якасьці рабочай схэмы быў у асноўным скарыстаны праект СНК РСФСР, які мае значную перавагу над іншымі праектамі (напрыклад, Інстытут Савец. буд. і права Камакадэміі, арганізаваны ЦВК РСФСР) сваёй большай канкрэтнасьцю.

Неабходна ў кароткіх рысах спыніцца на некаторых асабліваściях праекту.

Першыя два разьдзелы прысьвечаны агульным палажэньням і асноўным задачам гарсаветаў у пасобных галінах іх дзейнасьці. У іх дасьца характарыстыка зьместу работы гарадзкіх саветаў, як галоўных органаў дыктатуры пралетарыяту, вызначаецца ахоп іх функцый з паказаньнем мэта даў ажыцьцяўленьня тых задач і абавязкаў, якія ўскладзены на гарадзкія саветы. Гэтыя разьдзелы адбіваюць вялізарную ролю гарадзкіх саветаў, як тых органаў пралетарскай дзяржавы, праз якія, па характарыстыцы тав. Сталіна, — «праходзяць усе і ўсялякія мерапрыемствы па ўзмацненьні дыктатуры пралетарыяту і будаўніцтву сацыялізму... ажыцьцяўляецца дзяржаўнае кіраўніцтва сялянствам з боку пралетарыяту» *).

Новы праект, выходзячы з задач далейшай сацыялістычнай рэканструкцыі нашай краіны, аддае вялікую ўвагу пытаньням карэннай перабудовы гаспадаркі, якая знаходзіцца на тэрыторыі, падпарадкаванай гарадзкому савету. Пры гэтым улічана, што паказаная работа гарсаветаў павінна забясьпечыць уздым культурна - бытавога становішча працоўных, што адна часова стварае лепшыя ўмовы для ўзьяўленьня прадукцыйнасьці працы. Паводле праекту для актыўнейшай садзейнасьці разьвіцьцю сацыялістычнай прамысловасьці гарсаветы павінны ўсямерна дапамагаць папярэдняму ўдарніцтву і сацыялістычнага спаборніцтва і тым самым ствараць ўмовы для выкананьня і перавыкананьня прамфінпляну прадпрыемстваў горада. Падрабязнаму асьвятленьню гэтых абавязкаў прысьвечаны артыкул 16-ы праекту. У гэтым разьдзеле спэцыяльна прадугледжана, што гарадзкія саветы наглядаюць і за прамысловымі прадпрыемствамі рэспубліканскага і ўсесаюзнага значэньня. Гарсаветы павінны ўсямерна прымаць захады «да ўзмацненьня ва ўсіх прамысловых прадпрыемствах, якія знаходзяцца на падпарадкаванай тэрыторыі, сыстэмы адзіначаньня, укараненьня гаспадарчага разьліку, мабілізацыі ўнутраных рэсурсаў і г. д.» (п. 2, арт. 16). Пытаньню рэканструкцыі сельскай гаспадаркі прысьвечан арт. 17, які мае мэтай паказаць абавязкі гарадзкога савету ў галіне «аказаньня ўсебаковай дапамогі і забясьпечаньня пралетарскага ўплыву ў справе сацыялістычнай перабудовы сельскай гаспадаркі». Для ажыцьцяўленьня гэтай задачы гарсаветы «кіруюць і аказваюць дапамогу сельсаветам па арганізацыі на - гаспадарчым умацаваньні калгасаў, забясьпечваюць дапасоўваньне лепшага вопыту прамысловасьці і саўгасаў у калгасным будаўніцтве, стварэньне новай грамадзкай працдысцыпліны, пастаноўку правільнага вучоту, планаваньня і арганізацыі працы і на гэтай аснове завяршэньня суцэльнае калектывізацыі сельскай гаспадаркі» (п. 2, арт. 17).

У праекце досыць поўна выражаны такія адказьнейшыя галіны работы гарадзкіх саветаў як: падрыхтоўка кадраў і арганізацыя працы, забясьпечаньне, спажывецкая кааперацыя і савецкі гандаль, транспарт і сувязь, абарона краіны, сацыяльна - культурнае будаўніцтва і інш.

Мы, аднак ня лічым, што ўкладальнікі праекту цалкам здолелі ахапіць, дэталёва распрацаваць і поўнасьцю скарыстаць вопыт работы, які ёсьць у пасобных галінах сацыялістычнага будаўніцтва. Гэта можа быць рэалізавана толькі ў выніку масавага абгаварэньня праекту пасобнымі зацікаўленымі ўстановамі, органамі і арганізацыямі. Прыкладна — транспартная сэкцыя з удзелам прадстаўнікоў усіх відаў транспарту абгаворвае адпаведны разьдзел палажэньня; тое-ж робяць і іншыя сэкцыі гарсаветаў і ўста новы па пасобных галінах работы савету. Аўтары выказваюць упэўненасьць, што ажыцьцяўленьне гэтай прапановы будзе вырашана пры актыўнай дапамозе з боку кіраўніцтва гарсаветаў і іншых зацікаўленых устаноў. Нашы савецкія законы, якія адбіваюць дыктарэты і канцэнтраваную волю мільённых працоўных мас, зьяўляюцца блакітнымі, зразумелымі гэтым масам таму, што працоўныя, пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі, самі ствараюць свае законы, якія падводзяць вынік перамогам сацыялістычнага будаўніцтва і арганізуюць волю працоўных на далейшы наступ для канчатковай пабудовы сацыялізму.

* *

У свой час пан Троцкі «вкупе и влюбе» з меншавікамі імкнуўся давесьці, што саветы павінны быць формай органу самакіраўніцтва, адмаўляючы гэтым асноўную ролю саветаў як органаў улады.

Неабходна рашуча падкрэсьліць, што ліквідатарскія рэцыдывы, якія на даўна мелі месца ў адносінах да сельсаветаў, часам сустракаюцца ў той альбо іншай форме па лініі работы гарадзкіх саветаў. Гэтыя рэцыдывы з першага погляду звычайна, праяўляюцца ў «бяскрыўдным» форме: дэпутацкая група на заводзе не патрэбна, бо хопіць, моў, і завкому. У другіх выпадках ліквідатарскія настроі ідуць на лінію прапаноў аб скарачэньні палёт дзейнасьці гарадзкіх саветаў, перадачы пасобных прадпрыемстваў мясцовага значэньня РВК, ліквідацыі гарадзкога бюджэту.

Неабходна падкрэсьліць, што апошнія прапановы часам абгрунтоўваліся «тэорыяй» ператварэньня гарсавету—гэтага вышэйшага органу ўлады на падпарадкаваны тэрыторыі — у орган, які займаецца справамі толькі мясцовага значэньня, пераважна — камунальнымі справамі. Падобная пастаноўка пытаньня азначае поўнае неразуменьне пастаноў чэрвеньскага пленуму ЦК УсеКП(б) і XVII партыйнай канфэрэнцыі, якія вызначылі вядучую ролю гарадоў, як пралетарскіх цэнтраў, стваральных умовы для ліквідацыі супрацьлегласьцяй паміж горадам і вёскай.

Гэтае магутнае ўзьдзейнічаньне гарадоў, як пралетарскіх цэнтраў, знаходзіць поўнае пацьвярджэньне па прыкладзе нашай рэспублікі, якая на руінах, пакінутых рознымі акупантамі, здолела ператварыць многія гарады БССР у культурна - палітычныя цэнтры, што вядуць за сабой вёску, якая ўзьнялася з цемры мінулага. Трэба разумець, што работа гарсавету ў галіне рэканструкцыі гораду зусім не захопліваецца тымі рамкамі, якія ўкладаюцца некаторымі ў зьмест паняцьця «камунальная гаспадарка». Укладальнікі праекту, ставячы пытаньне аб перабудове камунальнай гаспадаркі, мелі на ўвазе, што работа гарсаветаў у гэтай галіне ня вычэрпвае ўсіх пытаньняў па сацыялістычнай рэканструкцыі гарадоў. Таму зусім не выпадкова, што разьдзел праекту, які ўключае ў сябе пытаньне каму

*) Сталін. «Пытаньні ленінізму». Выд. 4. 1931 г., стар. 725.

*) Кагановіч: «За сацыялістычную рэканструкцыю Масквы і гарадоў СССР» стар. 57

нальнай гаспадаркі, падначалены ўста ноўцы, што гарадзкія саветы ставяць сваёй задачай **сацыялістычную рэканструкцыю гораду і ўсіх паселішч**, пад пярадкаваных гарсавету ў адпаведнасьці з тэмпамі індустрыялізацыі краіны, ростам насельніцтва і культурна-бытавых патрэб шырокіх працоўных мас (арт. 19).

Гэтае палажэньне цалкам адпавядае тэй бальшавіцкай устаноўцы, якая

ПЯЦІДЗЁНЬНІК АГЛЯДУ РАБОТЫ БЮРО СКАРГАЎ РСІ

НІЗАВЫ ДРУК І РАБСЕЛЬКОРЫ павінны па-баявому ўключыцца ў пяцідзёньнік

Больш увагі пяцідзёньніку

Абвешчаны пастановай ЦКК НК РСІ пяцідзёньнік па агляду Бюро скаргаў РСІ пачаўся.

Пяцідзёньнік ставіць сваёй асноўнай мэтай карэнным чынам палепшыць работу Бюро скаргаў, уцягнуць у работу Бюро скаргаў новыя шырокія слаі рабочых і калгасьнікаў, асабліва жанчын.

Пяцідзёньнік зьяўляецца важнейшай палітычнай кампаніяй па рэалізацыі лёзунгу Ўладзімера Ільліча Леніна, аб тым, каб «усю працоўную масу мужчын і асабліва жанчын правесьці праз удзел у рабоце рабоча-сялянскай інспэкцыі» (з пастановы ЦКК УсеКП(б) і НК РСІ).

Выкананьне задач сацыялістычнага будаўніцтва патрабуе выразнасьці ў рабоце дзяржаўнага, гаспадарчага і каапэрацыйнага апарату. Між тым, яшчэ сустракаюцца факты скажэньня лініі партыі, праяўленьні бюракратызму, цяганіна, безгаспадарчасьць і няд байнасьць. Ня ўсюды як належыць пастаўлена справа штодзённай праверкі фактычнага выкананьня дырэктыў партыі і ўраду. У барацьбе з гэтымі хваравітымі зьявішчамі ў рабоце апарату Бюро скаргаў, як масавы орган РСІ павінна адыгрываць вялізарную ролю. Пастаноўка работы Бюро скаргаў, асабліва на мясцох, цалкам яшчэ не адпавядае пастаўленым задачам. Масавыя віды работы, як лятучыя праверкі, пастасы, нарады, рэйды разам з рабселькорамі яшчэ шырока ня ўжываюцца.

Пяцідзёньнік павінен зьявіцца ня толькі аглядам работы Бюро скаргаў, але і пачаткам рашучага пералому ў палепшаньні работы. Трэба пяцідзёньнік ператварыць у масавую праверку шырокімі коламі працоўных выкананьня дырэктыў партыі і ўраду і ўцягваньня новых мас працоўных у работу Бюро скаргаў.

У пяцідзёньніку агляду работы Бюро скаргаў павінен прымяць самы актыўны ўдзел нізавы фабрычна-заводскі і саўгасна-калгасны друк, прыцягваючы да ўдзелу ў пяцідзёньніку шырокія масы рабкораў і селькораў, папулярызуючы мэты і задачы пяцідзёньніка на старонках газэт.

Друк і рабселькоры павінны дапамагчы карэннаму пералому і палепшаньню работы Бюро скаргаў. Факты недаацэнкі работы Бюро скаргаў з боку раённага і нізавога друку не павінны мець месца.

Газэты і рабселькоры павінны зьявіцца ініцыятарамі разгортваньня сацспаборніцтва і ўдарніцтва ў рабоце Бюро скаргаў, разгарнуць шырокі паказ і перанясеньне лепшага вопыту іх работы на адстаючыя вучасткі.

Пяцідзёньнік трэба шырока скарыстаць з мэтай праверкі падрыхтаванасьці саўгасаў, калгасаў і аднаасобна га сэктару вёскі да масавага выхаду ў поле.

Пяцідзёньнік трэба паставіць як асноўную задачу, якая мабілізуе рабочых на выкананьне прамаўляльна селькасных і якасных паказьнікаў.

Пяцідзёньнік газэтамі павінен быць скарыстаны для масавай праверкі становішча рэагаваньня на рабселькораўскія допісы. Па гэтым пытаньні трэба разам з КК РСІ арганізоўваць масавыя рэйды рабкораў і селькораў.

Асаблівую ўвагу нізавы друк і рабселькоры павінны зьвярнуць на выяўленьне і рашучую барацьбу з праявамі зажыму крытыкі і самакрытыкі.

Аднак, весткі з месц гавораць, што ня ўвесь раённы і нізавы друк яшчэ ўключыліся ў правядзеньне пяцідзёньніка, некаторыя раённыя газэты абмежаваліся фармальным зьмяшчэньнем асобных допісаў аб пяцідзёньніку.

Пяцідзёньнік ня стаў яшчэ той масавай палітычнай кампаніяй, якую надае яму партыя ў справе мабілізацыі шырокіх працоўных мас гораду і вёскі па праверцы дырэктыў партыі і ўраду.

Задача раённага і нізавога друку пад кіраўніцтвам партарганізацыі мабілізаць шырокія масы працоўных на вырашэньне задач, якія стаяць у пяцідзёньніку.

Спасылаюцца на „аб'ектыўныя" прычыны

Смалявіны. Пытаньне аб правядзеньні пяцідзёньніку Бюро скаргаў, як у раёне, так і па мястэчку не знайшло належнай ўвагі на старонках ні газэты друку, а таксама і ў раённай газэце «Шлях калектывізацыі».

Раённая газэта зусім ігнаруе пытаньне пяцідзёньніка. Пастанова ЦКК КП(б)Б аб пяцідзёньніку ня была надрукавана. Таксама ніводзін допіс па гэтым пытаньні ня быў зьмешчаны. Па раёне ёсьць рад недахопаў у галіне калгаснага будаўніцтва, бюракратызм у райустановах, несваячасовае рэагаваньне на допісы селькораў. З боку раённай газэты і калгасных часьцеінфармацый ня была зьвернута ўвага на мабілізацыю мас рабселькораў аб значэньні пяцідзёньніку Бюро скаргаў у барацьбе за штодзённы кантроль па палепшаньні апарату.

У. Л.

„Няма часу займацца гэтай справай"

Менск. На кішэчным заводзе справа па правядзеньню пяцідзёньніку Бюро скаргаў знаходзіцца ў занядбадзе. Заводзкія арганізацыі да гэтага часу не разгарнулі работу па пяцідзёньніку. Мае месца недаацэнка з боку заводзкіх арганізацый. Напрыклад, тав. Ласавік кажа, што няма часу займацца гэтай справай.

Рабкоры і нізавы друк таксама ня ўдзельнічаюць у гэтай рабоце. Аб працы рабочых засядацеляў, прамадзкіх інспэктараў, заводзкія арганізацыі ня ведаюць.

Р. П.

Шматтыражка і рабкоры ў баку ад пяцідзёньніка

Для праверкі работы грамадзкіх інспэктараў, нарасядацеляў, на абутковай фабрыцы (Менск) арганізаваны брыгады, у якіх удзельнічалі брыгадзіры ад Бюро скаргаў ЦКК РСІ. Выяўлена, што нізавы друк слаба ўдзельнічае ў рабоце па пяцідзёньніку, абмежаваўся толькі выпускам агульна-фабрычнага бюлетэню.

Аб пяцідзёньніку Бюро скаргаў РСІ шматтыражка, а таксама і штодзённікі на цэхах ня ўявілі сабе важнасьці. Зусім яшчэ ня зьмешчаны толькі адзін допіс. Гэта тлумачыцца тым, што рабкоры і нізавы друк фабрыкі зусім бязьдзейнічаюць у гэтай важнай справе.

На фабрыцы пяцідзёньнік ня стаў асноўнай работай друку і рабкораў па мабілізацыі рабочых на выкананьне задач, што стаяць перад фабрыкай.

Х.

САЎГАСЫ КЛІМАЎШЧЫНЫ ГАТОВЫ

КЛІМАВІЧЫ. (Наш кар.). Саўгасы павінны быць у авангардзе падрыхтоўкі да сяўбы. Па такім шляху ідуць саўгасы «Ціманава» і імя 16 партызан. Саўгас «Ціманава» скончыў засыпку насьнефондаў на 100 проц., а «16 партызан»—на 102 проц. Рамонт інвэнтара і ачыстка насьнення ў саўгасах закончана. Па-баявому заканчваюць падрыхтоўку да сяўбы і саўгасы «Высокае» і «Прывольле». Саўгас «Высокае» засыпаў насьнефонды бульбы і ячменю на 100 проц.

Саўгасы Клімаўшчыны сваю гатоўнасьць да сяўбы правяраюць пробнымі выездамі ў поле.

П. Кавалёў.

Па БССР



Новы двухвагонны трамвай у Менску.

Своячасова скончыць перавыбары саветаў

КОЙДАНОВА (наш сцэнкор). Гэтымі днямі адбылося паседжаньне Койданаўскай раённай выбарчай камісіі, на якой стаяла пытаньне аб ходзе справаздачна-перавыбарчай кампаніі саветаў з боку калгасьнікаў, беднякоў і серадняко ў-аднаасобнікаў наглядаецца вялікая актыўнасьць і зацікаўленасьць у перавыбарах саветаў; перавыбары сельсаветаў увязваюцца з усімі гаспадарча-палітычнымі задачамі, якія зараз стаяць перад раёнам.

Прыкладам добрай падрыхтаванасьці да справаздачна-перавыбарчай кампаніі сельсаветаў можа служыць выбарчая камісія Паланёўскага сельсавету, якая шляхам арганізацыі перавыбарчыкаў пераз заду, мабілізацыі вучняў на догляд дзяцей і аховы маёмасьці ў дамох, дабілася 92,4 проц. яўкі выбарчыкаў на справаздачна-перавыбарчыя сходы.

Добра правяла сваю работу па падрыхтоўцы да перавыбараў, па мабілізацыі калгасных, бядняцка-серадняцкіх мас выбарчыя камісіі Ляхоўскага і Путчынскага сельсаветаў.

У адзнаку справаздачна-перавыбарчай кампаніі, калгасьнікі гэтых сельсаветаў правялі вялікую актыўнасьць па мабілізацыі ўнутраных кармовых рэсурсаў, шляхам якіх калгасьнікамі сабрана каля 17 цнт. сена, звыш 133 цнт. саломы, і 800 руб. трошай.

Побач з тымі сельсаветамі, у якіх добра праведзена падрыхтоўчая работа, у якіх добрыя вынікі самых перавыбараў, ёсьць і такія, якія перавыбары саветаў сустрэлі зусім неспадрыхтаванымі. Напрыклад: у выніку дрэнна праведзенай падрыхтоўчай работы выбарчымі камісіямі Дабрынеўскага, Старынкаўскага і Вязёрскага сельсаветаў, па некаторых выбарчых вучастках гэтых сельсаветаў справаздачна-перавыбарчыя сходы былі сарваны.

Як вялікі недахоп у перавыбарах трэба адзначыць тое, што з боку выбарчых камісій мала зьвернута ўвагі на ўцягненьне ў справаздачна-перавыбарчыя сходы, а таксама і ў самыя выбары ў склад сельсаветаў працоўных жанчын.

Зусім кароткі тэрмін застаўся да раённага зьезду саветаў (28-IV). Трэба пабальшэйшу мабілізаваць рабочых, калгасных і бядняцка-серадняцкія масы на своячасовае скончэньне перавыбараў сельсаветаў і ў поўнай падрыхтаванасьці сустрэць раённы зьезд.

Маркаў.

Пабудуем танк імя Бірабіджану

(Да ўсіх райарганізацый і членаў АЗЭТ БССР)

Да дню сьвяткаваньня 14-й гадавіны нашай доблеснай Чырвонай арміі Ленінградзкая Озэт-арганізацыя рашыла пабудаваць танк імя «Бірабіджана», які ўвойдзе ў танкавую калёну імя Бірабіджана для нашай Далёка-Ўсходняй Чырвонай арміі.

Ленінградзкі Озэт выклікаў беларускую Озэт-арганізацыю пасьледаваць яго прыкладу. Зьяўляецца лішнім над крэсьліваць тое вялікае значэньне гэтай справы. Цэлая калёна танкаў імя Бірабіджана будзе прыпаднесена нашай гераічнай Далёка-Ўсходняй Чырвонай арміі ад імя інтэрнацыянальнай пралетарскай грамадзкасьці «Озэт».

Белозэт на паседжаньні прэзыдыуму парашыў: прыняць выклік Ленінградзкага Озэту і зараз-жа разгарнуць работу па зборы сродкаў на пабудову танка імя шэфства БССР над Бірабіджанскім раёнам.

Шэфства БССР над Бірабіджанскім раёнам абавязана да вялікіх работ па ўсіх галінах сацбудаўніцтва Бірабіджана. Мы прыступілі да гэтай справы і ўжо прыходзім з канкрэтнымі паказьнікамі.

Абавязаць кіраўнікоў устаноў, у якіх працуюць студэнты вячэрняй групы Пляванава-Эканамічнага інстытуту, па цыклі пляніраваньня прац, аслабаніць іх для праходжаньня вытворчай практыкі на тэхнічным нармаваньні і эканоміцы працы, тэрмінам на 4 м-цы—з 15-IV па 15-VIII 1932 г.

2. Разьмеркаваць студэнтаў вышэйпаказанай групы для праходжаньня вытворчай практыкі па тэхнічным нармаваньні і эканоміцы працы па наступных арганізацыях:

1. Наркамправы	6 чалавек
2. Мэталяабʼяднаньне	8 „
3. Торфаабʼяднаньне	5 „
4. Абʼяднаньне будматарʼял	4 „
5. Белбудабʼяднаньне	4 „

3. Абавязаць кіраўнікоў абʼяднаньняў і сэкцый арганізацыі і аздараўленьня ўмоў працы НКПБ скарыстаць паказаных студэнтаў выключна на тэхнічным нармаваньні і эканоміцы працы непасрэдна на прадпрыемствах, забясьпечыўшых адпаведным кіраўніцтвам.

4. За час праходжаньня вытворчай практыкі паказаныя студэнты атрымліваюць зарплату ад прадпрыемстваў і арганізацый, дае яны будуць працаваць на выконванай рабоце, але ня ніжэй 100 руб. у месяц.

5. Па скончэньні практыкі студэнты павінны зьвярнуцца па свае сталыя месцы працы.

Народны Камісар Працы БССР БАСКІН.

Пра разгортваньне гандлёвай сеткі спажывецкай каапэрацыі

Пастанова Эканамічнага Савету БССР

Эканамічны Савет БССР адзначае, што ў выніку ажыцьцяўленьня адозвы СНК Саюзу ССР, ЦК УсеКП(б) і Цэнтрасаюзу «Пра спажывецкую каапэрацыю» (З.З. СССР 1931 г., № 29, арт. 224) і адозвы СНК БССР і ЦК КП(б)Б «Пра спажывецкую каапэрацыю» (З.З. БССР 1931 г., № 23 паст. 172) сетка раздробных магазынаў спажывецкай каапэрацыі ў гарадох павялічылася. У параўнаньні з сеткай, якая была на 1 ліпеня 1931 г., яна павялічылася на 32 проц. ці на 226 адзінак. Станоўчым моментам у гэтай рабоце зьяўляецца і тое, што пераважная колькасьць новых магазынаў—80,7 проц. прыпадае на харчовую групу (гародна-фруктовых 47,9 проц., малочных 5,1 проц., хлебных 13,5 проц., бакалейных і гастранамічных—14,2 проц., прамтаварных 19,3 проц. Але ня гледзячы на пашырэньне гандлёвай сеткі, на адчыненьне спэцыялізаваных магазынаў, колькасьць гандлёвых пунктаў усё яшчэ не забясьпечвае шырокага разгортваньня савецкага гандлю і раёны, заселеныя рабочымі, слаба насычаны гандлёвымі пунктамі, а існуючыя пункты не адпавядаюць запатрабаваньням культурнага гандлю, што ў выніку апортуністычнай недаацэнкі радам каапэрацыйных арганізацый значэньня разгортваньня савецкага гандлю, будаўніцтва савецкіх базараў пра ходзіць з вялікай зацяжкай. Плян адчыненьня савецкіх базараў у IV квартале ў значнай меры недавыкананы, замест 27 базараў на 330 ларкоў, у тым ліку ў гарадох 21 на 266 ларкоў, усяго ад чынена ў гарадох 9 базараў на 150 ларкоў.

Асобныя гарадзкія саветы—Менскі, Полацкі і Аршанскі ня робяць амаль ніякай дапамогі спажывецкай каапэрацыі ў разгортваньні сеткі крам і савецкіх базараў і марудзяць з адводам зямельных вучасткаў.

Бяручы пад увагу паказанае вышэй, Эканамічны Савет БССР пастанаўляе:

1. Задзвердзіць плян павялічэньня ў 1932 г. гандлёвай сеткі на 170 крам, 759 ларкоў і коскаў, 541 латкоў, 100 развозак, 150 дамовых крам.

Для магазынаў павінна быць пабудавана 70 памяшканьняў і 100 адноўленьня за лік гандлёвай плошчы, нескарыстаная для гэтага.

2. Лічыць патрэбным павялічыць сетку гандлёвых пунктаў у гарадох, асабліва дробную, і максымальна наблізіць гандаль да месца пражываньня і работы рабочага спажыўца і каб ня менш 70 прац. пунктаў былі адчынены ў раёнах, заселеных рабочымі.

3. Прапанаваць Народнаму Камісарыяту Камунальнай Гаспадаркі і Белжыльсаюзу і ўсім дзяржаўным і каапэрацыйным арганізацыям, якія праводзяць пасялковае і жыльлёвае будаўніцтва ў адпаведнасьці з пастановай ЦВК ад 11 верасьня 1929 г. «Пра разьвіцьцё дробны гандаль» (З. З. СССР 1929 г., № 58, арт. 544) прадугледзець у плянах будаўніцтва гандлёвых памяшканьняў.

4. Абавязаць Народны Камісарыят Камунальнай Гаспадаркі, Белжылсаюз, Дзяржгандаль і Белкапсаюз на працягу дэкады дакладна ўстанавіць спіс жылых дамоў і пасёлкаў, якія запраектаваны да будаўніцтва, у якіх трэба пабудаваць магазыны і аформіць будаўніцтва крам у гэтых дамох адпаведнымі дагаворамі з Белкапсаюзам.

5. Прапанаваць ўсім гарадзкім саветам і раённым выканаўчым камітэтам рабіць спажывецкай каапэрацыі максымальную дапамогу ў разгортваньні сеткі—даючы памяшканьняў, на працягу 2-х дэкад узяць на ўлік усе памяшканьні, асабліва ў раёнах, заселеных рабочымі, якія могуць быць скарыстаны для крам, а таксама тыя крамныя памяшканьні, якія заняты не на беспасрэднае прызначэньне. Усе адзначаныя памяшканьні павінны быць адзначаныя памяшканьні павінны быць апарожнены і перададзены спажывецкай каапэрацыі і Дзяржгандлю для скары станьня пад гандлёвыя пункты.

6. Абавязаць Белкапсаюз скончыць будаўніцтва базараў у адпаведнасьці з пастановай СНК БССР за 4 студзеня 1932 г. «Пра арганізацыю самастойных загатовак сельскагаспадарчых прадуктаў, разгортваньне раздробнага саўгасна-калгаснага гандлю і пра сетку савецкіх базараў» (З. З. БССР 1932 г., № 7, паст. 32).

З агульнага ліку гандлёвых месц на савецкіх базарах (крам, ларкоў, столікаў), якія будуюцца Белкапсаюзам і Дзяржгандлем, адвесьці ня менш 50 проц. для гандлю саўгасаў і калгасаў, а таксама гарадзкія саветы павінны выдзяліць месцы для продажу з вазоў.

Гандлёвыя месцы здаюцца калгасамі і саўгасамі па дагаворах, аб чым Белкалгасцэнтр і саўгасныя трэсты павінны даць адпаведныя паказаньні калгасам і саўгасам.

7. Прапанаваць старшыні Белкалгасцэнтру т. Міцькову на працягу 2-х дэкад арганізаваць узорны масавы выезд калгасаў і калгасьнікаў на базары у Менск, Віцебск, Барысаў, Гомель і Слуцк і даць дырэктыву ўсім раённым калгасьнікам аб растлумачэньні калгасьнікам значэньня савецкіх базараў, іх арганізацыі і выезьдзе калгасаў і калгасьнікаў на гэтыя базары.

8. Абавязаць Белкапсаюз і ўсе каапэрацыйныя і дзяржаўныя гандлёвыя арганізацыі ў найхутчэйшы тэрмін да біцца поўнага перабудаваньня работы магазынаў праз укараненьне сапраўднага гаспадарчага разрахунку ў іх работу, палепшаньне ўнутранага распорадку і якасьці абслугоўваньня спажыўцоў, зьнішчэньне чаргі, палепшаньне санітарнага становішча і звадворнага выгляду магазынаў.

Старшыня Савету Народных Камісараў і Эканамічнага Савету БССР М. Галадзед.

Кіраўнік спраў Савету Народных Камісараў і Эканамічнага Савету БССР С. Кандыбовіч.

7 красавіка 1932 г.
г. Менск.

Пра ліміты кошту адн го кубамэтру непр м слова вага будаўніцтва ў 1932 г.

Пастанова Эканамічнага Савету БССР

Эканамічны Савет БССР пастанаўляе:

1) Устанавіць наступныя ліміты кошту аднаго кубамэтру непрамысловага будаўніцтва:

а) для зьвычайных цаглянных шматпавярховых будынкаў з агнятрывалымі дахам на каменным падмурку з драўлянымі, памяшканпяроховымі перакрыцьцямі, апроч памяшканьняў, якія павод ле будаўнічых праэкт павінны абазнакова перакрываацца агнятрывалымі перакрыцьцямі з пячным ацяпленьнем і ўнутранай атынкоўкай без водаправоду і каналізацыі—22 руб. кб. мэтр;

б) для будынкаў драўляных каркасных з агнятрывалым дахам на каменным падмурку з пячным ацяпленьнем без водаправоду, каналізацыі і ўнутранай і знадворнай атынкоўкай сьцен—у гарадзкой мяжы—17 руб. 50 кап., у іншых мясцовасьцях—16 руб. 50 кап.

2) Забараніць усім арганізацыям у дагаворах, яны заключаюцца на будаўніцтва, устанаўліваць іншы кошт аднаго кубамэтру.

3) Даручыць Дзяржплану ў разьбіцьці гэтай пастановы на працягу 3 дзён устанавіць:

а) якія выдаткі ўваходзяць у асноўныя ліміты;

б) процант набаўкі да асноўных лімітаў або зьніжэньне іх у залежнасьці ад тыпу і характару будаўніцтва (водаправод, ацяпленьне);

в) тэхнічнае апісаньне работ па непрамысловым будаўніцтве.

Старшыня СНК і Эканамічнага Савету БССР М. Галадзед.

Кіраўнік Спраў СНК і Эканам. Савету БССР С. Кандыбовіч.

2-га красавіка 1932 г.
г. Менск.
№ 54.

Пастанова Ўрадавай камісіі па бесьперапынным і перапынным вытворчым тыдні

«ПРА ЎСТАНАЎЛЕНЬНЕ Ў ВЫТВОРЧЫХ ПРАДПРЫЕМСТВАХ СКАЛЬЗЯЧАЙ ШКАЛЫ ВЫХОДНЫХ ДЗЁН»

Урадавая Камісія па бесьперапынным і перапынным вытворчым тыдні пры СНК БССР пастанаўляе:

1. Абавязаць Кіраўнікоў прамысловых прадпрыемстваў, у якіх часова ўведзены шасьцідзённы перапынны вытворчы тыдзень, устанавіць скальзячую шкалу выходных дзён.

Пры ўжываньні скальзячай шкалы выходныя дні павінны прадстаўляцца па графіку, незалежна ад чысел месяца.

Рэвалюцыйныя сьвяты ў лік рабочых дзён не ўваходзяць і пры пабудове графікаў павінны быць з шкалы выключаны.

2. Прапанаваць Раённа-гарадзкім Інспэкцыям Працы ў дэкадны тэрмін па ўзгадненьні з Кіраўніцтвам прадпрыемстваў і прафарганізацый, зрабіць разьбіўку ўсіх прадпрыемстваў на групы, устанавіўшы ў іх розныя выходныя дні, абавязкова ўлічваючы пры гэтым інтарэсы энэрга-снабжэньня і пытаньні сацыяльна-бытовага і культурнага абслугоўваньня працоўных.

Пры ўстанаўленьні разьбіўкі не дапушчаць агульнага ўстанаўленьня выходных дзён на 6, 12, 18, 24 і 30.

3. Гэта пастанова не распраецца на саўгасы і МТС, прадпрыемствы лесапрацоўчай прамысловасьці і будаўнічыя работы (новае будаўніцтва і капітальны рамонт), рэжым рабочага часу ў якіх рэгулюецца для саўгасаў і МТС пастановай НКП СССР ад 16-III-32 г. № 42, у лесапрацоўчых прадпрыемствах — пастановай Урадавай Камісіі СНК СССР ад 17-III-32 г. № 30/83 і на будаўнічых работах—пастановай Урадавай Камісіі СНК СССР ад 19-II-32 г. № 15/68.

Старшыня Ўрадавай Камісіі па бесьперапынным і перапынным вытворчым тыдні пры СНК БССР БАСКІН.

Адказны сакратар ГОЛЬДЗІНБЭРГ.

9 красавіка 1932 г.
г. Менск.

Пра ўтварэньне камісій для прыёмкі першай чаргі Гомсельмаша і трыкатажнай фабрыкі імя „КІМ"

Пастанова Эканамічнага Савету БССР

Эканамічны Савет БССР пастанаўляе:

1. Для прыёмкі першай чаргі Гомсельмаша стварыць камісію ў складзе: т. т. Арндта (Старшыня), Браўковіча, Вагнера, Валюкевіча, Камаева, Прытыкіна і рабочага заводу «Пралетары» тав. С. Балтэвіча.

2. Для прыёмкі трыкатажнай фабрыкі імя «КІМ» стварыць камісію ў складзе т. т. Валасевіча (Старшыня) Жуковіча, Носаша, Эрэнбурга, Аўчынка і работніцы фабрыкі імя Клары Цэткін тав. Х. Віхман.

Старшыня Савету Народных Камісараў і Эканамічнага Савету БССР М. Галадзед.

Кіраўнік спраў Савету Народных Камісараў і Эканомсавету БССР С. Кандыбовіч.

Канфэрэнцыя Асоавіяхіму Менскай арганізацыі

12 красавіка ў памяшканьні дзяржаўнага тэатру адкрылася канфэрэнцыя Менскай арганізацыі Асоавіяхіму.

▲ Апрыч рабочага прэзыдыуму, у гаровы прэзыдыум канфэрэнцыі абрала Палітбюро ЦК УсеКП(б), Рэўваенсавет СССР, ЦК КП(б)Б тав. Гікало, старшыню ЦС АСО СССР, члена Рэўваенсавету СССР тав. Эйдэмана, тав. Убарэвіча, сакратара кампартыі Германіі—тав. Тэльмана, кампартыі Францыі—тав. Кашэна, кампартыі Польшчы—тав. Ленскага.

▲ Канфэрэнцыю віталі калёны вучэбных пунктаў АСО і каманды СПА, АБВШ, асоавіяхімаўцы заводу «Каму нар», флі «Кастрычнік», «Чырвоны абутнік».

▲ З вялікім дакладам аб міжнародным становішчы і задачах АСО ў сьвятле рашэньняў XVII усесаюзнай партканфэрэнцыі і III пленуму ЦС АСО СССР выступіў намесьнік старшыні ЦС АСО БССР тав. С. М. Дрылёнак, якога канфэрэнцыя заслухала з вялікай увагай.

▲ На паседжаньні 13 красавіка канфэрэнцыя заслухала даклад Менскага гарсавету АСО і рэвізійнай камісіі, якія выявілі шырокія дзеловыя спрэчкі.

▲ Даклад тав. Дрылёнка будзе зьмешчаны на старонках «Савецкай Беларусі» у бліжэйшыя дні.

Страляць, як Нарком

Асоавіяхімаўцы, якія віталі 12 красьпічніка Менскую гарадзкую канфэрэнцыю АСО у падарунак ёй перадалі мішэні лепшых стралкоў, якія сьведчаць аб посьпехах АСО ў справе аўзаданьня тэхнікай стралковай справы.

Вось лепшыя, якія на справе імкнуцца «страляць як Нарком»

З 50 магчымых стралаў зроблена па паданьняў:

Засадыч — 48 пападаньняў,
Рубэнчык — 47 пападаньняў,
Трук — 46 пападаньняў,
Росін — 45 пападаньняў,
Эванчык — 45 пападаньняў,
Коган Люся — 45 пападаньняў,
Бабіцкая — 42 пападаньні,
Тусік — 41 пападаньняў,
Галашынскі — 40 пападаньняў,
Трус — 40 пападаньняў,
Гольдзін — 40 пападаньняў,

ПАПРАЎКА.

У нумары № 83 «Савецкай Беларусі» за 13 красавіка ў артыкуле «АБВШ—на дапамогу заводу імя Варашылава» (3 стар.) Подпісь трэба чытаць так:

«Сакратар ячэйкі Асоавіяхіму АБВШ Лысенка».

Дом асьветы.

Гарком саюзу працасьветы закупіў для асьветнікаў у БДТ—1 на 20-IV—1932 г. пастаноўку «МОСТ». Білеты ў канцылярыі гаркому Саюзу Працасьветы з 6 да 10 гадз. зечара.

Адказны рэдактар П. ШАСТАКОЎ.

ГУКАВЫ КІНО-ТЭАТР „ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА" Каса з 1 г. дня	КАЦЬКА ПАПЯРОВЫ РАНЭТ
КІНО „ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ" Каса ад 12 гадз.	ЦЫГАНСКАЯ КРОЎ
КІНО „ПРАЛЕТАРЫ"	ІГРА З АГНЁМ

ЗАГАД № 87

па Народнаму Камісарыяту Земляробства БССР

ад 11 красавіка 1932 г.

§ 1.

За бюракратычныя адносіны і недаацэнку дасьледчай работы па наглядзьні за станам азімых пасеваў—паставіць на від дырэктару Турскай Дасьледчай Станцыі тав. РАДКЕВІЧУ, прапанаваўшы апошняму больш сур'ёзна падыходзіць да складаньня ўмоў працы працаўнікоў Гідрамэтінстытуту і забясьпечыць выкананьне гэтай працы.

Паказанае спагнаньне апублікаваць у друку і паведзіць усіх дырэктароў саўгасаў, дасьледчых станцый, тэхнікумаў аб неабходнасьці аказаньня поўнай дапамогі сыстэмам Гідрамэтінстытуту ў яго працы па наглядзьні за азімымі.

Народны Камісар Земляробства БССР Рачыцкі

Даводзіцца да ведама дзяржаўных, каапэрацыйных устаноў і прыватных асоб, што

ЧЫРВОНА-СЛАБОДЗКІ РАЙХЛЕБЖЫВЁЛСАЮЗ (РАЙКААПСАЮЗ)

ЛІКВІДУЕЦЦА

Усе прэтэнзіі да Райкаапжывёлсаюзу будуць прымацца ліквідкамісіяй да 20-га красавіка 1932 г.

Пасьля гэтага тэрміну ніякія прэтэнзіі прымацца ня будуць

Ліквідком

ПАСТАНОВА

Народнага Камісарыяту Працы БССР

ад 9 красавіка 1932 г. № 18 гор. Менск

Надаючы вялізарнае значэньне пытаньням рацыянальнае арганізацыі вытворчасьці, тэхнічнаму нармаваньню і эканоміцы працы, Народны Камісарыят Працы БССР ПАСТАНАЎЛЯЕ:

1. Абавязаць кіраўнікоў устаноў, у якіх працуюць студэнты вячэрняй групы Пляванава-Эканамічнага інстытуту, па цыклі пляніраваньня прац, аслабаніць іх для праходжаньня вытворчай практыкі на тэхнічным нармаваньні і эканоміцы працы, тэрмінам на 4 м-цы—з 15-IV па 15-VIII 1932 г.

2. Разьмеркаваць студэнтаў вышэйпаказанай групы для праходжаньня вытворчай практыкі па тэхнічным нармаваньні і эканоміцы працы па наступных арганізацыях:

1. Наркамправы	6 чалавек
2. Мэталяабʼяднаньне	8 „
3. Торфаабʼяднаньне	5 „
4. Абʼяднаньне будматарʼял	4 „
5. Белбудабʼяднаньне	4 „

3. Абавязаць кіраўнікоў абʼяднаньняў і сэкцый арганізацыі і аздараўленьня ўмоў працы НКПБ скарыстаць паказаных студэнтаў выключна на тэхнічным нармаваньні і эканоміцы працы непасрэдна на прадпрыемствах, забясьпечыўшых адпаведным кіраўніцтвам.

4. За час праходжаньня вытворчай практыкі паказаныя студэнты атрымліваюць зарплату ад прадпрыемстваў і арганізацый, дае яны будуць працаваць на выконванай рабоце, але ня ніжэй 100 руб. у месяц.

5. Па скончэньні практыкі студэнты павінны зьвярнуцца па свае сталыя месцы працы.

Народны Камісар Працы БССР БАСКІН.

Даводзіцца да ведама ўсіх зацікаўленых устаноў і прыватных асоб,

што на падставе пастановы СНК БССР ад 29-II 1932 году

БЯГОМЛЬСКІ РАЙКААПСАЮЗ ЛІКВІДУЕЦЦА

Прэтэнзіі да Райкаапсаюзу будуць прымацца ліквідкомам на працягу двухтыдзёвага тэрміну з дню апублікаваньня.

ПАСЬЛЯ ГЭТАГА ТЭРМІНУ ніякія прэтэнзіі ПРЫНЯТЫ НЯ БУДУЦЬ

Ліквідком

АБ'ЯВА АБ РЭГІСТРАЦЫІ НАРОДНЫМ КАМІСАРЫЯТАМ ФІНАНСАЎ БССР

на падставе арт. 2 4 Палажэньня аб дзяржаўнай рэгістрацыі ад 9-II 1931 г. (Збор Законаў і Загадаў СССР № 8, паст. 99)

ЗАРЭГІСТРАВАНА Ў РЭЕСТРЫ ЮРЫДЫЧНЫХ АСОБ за № 114 (сто чатырнаццаць)

Дзяржаўны Будаўнічы Трэст

ПРЫ БЕЛАРУСКІМ КІРАЎНІЦТВЕ СУВЯЗІ

Месцазнаходжаньне трэсту—Менск, Карла Маркса, 10. Кант. рахунак у Дзяржбанку № 77-26

ГОМЕЛЬСКАМУ БУДАЎНІЧАМУ КІРАЎНІЦТВУ ПАТРЭБНЫ:

тэхнікаў-будаўнікоў—2,
тэхнікаў-мэханікаў—2,
аж. ТНВ,—1,
аж. тэхнікай бясьпекі—1,
мэханічных мацёраў—3,
нарміроўшчыкаў-расцэнщчыкаў па мэханічных работах—2,
машыністаў лёгкамабільнай станцыі—1.

УМОВЫ ПА ЗГОДЗЕ

Кватэра прадастаўляецца
Праезд аплачваецца

Адрас: Гомель, Шклобуд

КАЛГАСЦЭНТР БССР і ўсе спэцыяльныя калгасныя цэнтры і саюзы ПЕРАЕХАЛІ з Цэнтральнага Дому Калгасьніка ў д. № 28, па вул. Энгельса

ЗГУБЛЕНЫ квіткі, выданыя ст. Менск на адпраўку грузаў за №№ 56715 і 57068 і квіткі накладной платы за №№ 193988 і 194050 на суму 302 руб. і 40 кап.

лічыць несапраўднымі

ЗГУБЛЕНЫ:

Камсамольскі білет Пыркова Ф. З. выд. Дрыбінскім райкомам. за 165640. Квіт 1273 п.

Пасьведчаньне Лемешко А. С. выд. Радзінскім сельсаветам, вайсковая кніжка і конская выд. Горацкім васькаматам. Квіт 1273 п.

Асабовае пасьведчаньне Фракіна С. С. выд. Ташкенцкай міліцыі кастрычніцкага раёну у 1928 г. Квіт 1273 п.

Пасьведчаньне Хадарэнка П. У. выд. Паршынскай пачатковай школай у 1927 г. Квіт 1273 п.

Вайсковая кніжка Кітанёна Р. Г. выд. Бабруйскім ваенкаматам. Квіт 1273 п.

Паевая кніжка за 137 Гродзінскай Д. Н. выд. Асталопаўскай каапэрацыяй. Квіт 1273 п.

Вайсковая, красназармейская кніжка Вараб'ёва І. А. выд. Горацкім РВК. Квіт 1273 п.

Лінейная калібровочная мішень LRT-BE4-V2